Жыхары Шаркаўшчыны і ўсяго раёна зусім хутка змогуць атрымліваць медыцынскія паслугі ў новым будынку раённай бальніцы. Цікава, што старая бальніца знаходзіцца на тэрыторыі былой панскай сядзібы. СТАР 3

У Мінадукацыі падвялі папярэднія вынікі прыёмнай кампаніі ва ўстановах прафтэхадукацыі. Найбольш запатрабаванай аказалася прафесія «слесар па рамонце аўтамабіляў». СТАР 5

Сёлета роду Бонч-Асмалоўскіх (і аднайменнай вёсцы Асмолавічы) споўнілася 500 гадоў. І гэта толькі па афіцыйных звестках, а насамрэч гісторыя сям'і можа быць яшчэ глыбейшай. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

26 ВЕРАСНЯ 2012 г. СЕРАДА № 186 (27301) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА І ГЕРМАН ГРЭФ АБМЕРКАВАЛІ ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СУПРАЦОЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ З АШЧАДНЫМ БАНКАМ РАСІІ

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць магчымым вывесці супрацоўніцтва Беларусі з Ашчадным банкам Расіі на новую ступень. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў 25 верасня, сустракаючыся са старшынёй праўлення Ашчаднага банка Расіі Германам Грэфам.

«Мы з вамі дамаўляліся, што праз пэўны прамежак часу сустрэнемся і разам прапануем нейкія новыя варыянты супрацоўніцтва, каб выйсці на больш высокую ступень гэтага супрацоўніцтва», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гатовы ўдзельнічаць у абмеркаванні гэтых прапаноў. «Калі яны прымальныя для нас, то мы з задавальненнем пойдзем насустрач такому гіганту, як Ашчадны банк Расіі», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў той факт, што месцам правядзення форуму сваіх даччыных прадпрыемстваў Ашчадны банк выбраў менавіта Беларусь: «Нам прыемна гэта. Гэта ў нейкай ступені давер да нашай краіны».

У сваю чаргу Герман Грэф выказаў удзячнасць беларускаму боку за актыўнае супрацоўніцтва на працягу апошніх гадоў. «Тыя планы, якія мы намячалі да канца 2014 года і якія зафіксаваны ў інвестыцыйным пагадненні паміж намі і ўрадам Беларусі, практычна ўвесь аб'ём абавязацельстваў будзе выкананы да канца гэтага года — за два гады да заканчэння таго тэрміну, аб якім мы дамаўляліся», — сказаў старшыня праўлення Ашчаднага банка.

У ходзе сустрэчы быў абмеркаваны ўвесь спектр пытанняў, якія датычацца дзейнасці Ашчаднага банка ў Беларусі, у тым ліку ўкараненне новых тэхналогій і паслуг у банкаўскай сферы Беларусі. «Сёння мы вельмі актыўна працуем у рэспубліцы. Сукупны аб'ём прадастаўленых рэсурсаў за апошнія тры гады з боку Ашчаднага банка склаў звыш $11 млрд. Цяпер у нас адкрыты лініі на рэспубліку звыш $6,5 млрд. Гэта, вядома, самыя буйныя пазіцыі сярод усіх замежных банкаў», — расказаў Герман Грэф.

Старшыня праўлення Ашчаднага банка Расіі пацвердзіў рэфінансаванне крэдыту «Беларуськалія» ў $1 млрд. Таксама абмеркавана магчымасць удзелу Ашчаднага банка ў рэалізацыі розных інвестыцыйных праектаў. Адзін з буйнейшых такіх праектаў — распрацоўка калійнага радовішча ў Беларусі.

Герман Грэф падзякаваў Аляксандру Лукашэнку за падтрымку, якая на працягу апошніх трох гадоў аказвалася дзейнасці Ашчаднага банка ў Беларусі. «Мы маем вельмі добрыя вынікі нашага бізнэсу,» — падкрэсліў ён.

Група Ашчаднага банка Расіі з'яўляецца буйной міжнароднай фінансавай арганізацыяй. Яна прадстаўлена ў 18 краінах. Філіяльная сетка гэтага банка ўключае 17 тэрытарыяльных банкаў і больш за 19 тыс. падраздзяленняў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Даччыныя банкі Ашчаднага банка Расіі працуюць у Беларусі, Казахстане і Украіне. Адкрыты прадстаўніцтвы ў Германіі, Кітаі і філіял у Індыі. Па рынкавай капіталізацыі Ашчадны банк Расіі ўвайшоў у топ-20 буйнейшых банкаў свету і займае 16-е месца.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў ПАШЫРЭННІ СУПРАЦОЎНІЦТВА З МІЖНАРОДНАЙ ФЕДЭРАЦЫЯЙ ТАВАРЫСТВАЎ ЧЫРВОНАГА КРЫЖА І ЧЫРВОНАГА ПАЎМЕСЯЦА

Пра гэта заявіў прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на сустрэчы з прэзідэнтам гэтай міжнароднай арганізацыі Тадатэру Каное, перадае БЕЛТА.

«Лічу, што ў нас магло б быць больш сумесных праектаў для супрацоўніцтва», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. Ён падзякаваў Тадатэру Каное за інтарэс да работы Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа. «Работу гэтай арганізацыі мы падтрымліваем на дзяржаўным узроўні. Яна пазнаецца ў краіне, грамадстве, а гэта значыць, што ажыццяўляецца канкрэтная практычная дзейнасць, патрэбная людзям», — дадаў прэм'ер-міністр.

Ён падкрэсліў, што Беларусь гатова ўлічыць рэкамендацыі Міжнароднай Федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Паўмесяца. «Мы адкрыты для супрацоўніцтва і ўважліва ставімся да рэкамендацый міжнародных арганізацый, — заявіў ён. — Ваш візіт — гэта новая старонка ў развіцці таварыства і вашай высакароднай місіі».

Як адзначыў Тадатэру Каное ў інтэрв'ю журналістам, гэта яго першы візіт у Беларусь. Ён высока ацаніў работу Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, а таксама ўзровень узаемадзеяння ўрада з гэтай арганізацыяй. «Такая форма партнёрства можа стаць мадэллю для многіх нацыянальных таварыстваў, — падкрэсліў ён. — Я ўжо вывучыў, што зроблена Беларускім таварыствам Чырвонага Крыжа. Лічу, наступныя гады мы зможам больш нарасціць супрацоўніцтва».

Тадатэру Каное дадаў, што ў рамках бягучага візіту ў Беларусь падпісаны шэраг міжнародных дакументаў аб партнёрстве.

САМЫЯ ДАПЫТЛІВЫЯ «ВЕРШНІКІ»

Маленькія мінчукі на адной з выставак тэхнікі, якую вырабляюць на сталічным мотавелазаводзе.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Канстанцін СУМАР, старшыня Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта:

«У Беларусі створана шырокая нарматыўная база. І сёння сенатарам важна сканцэнтраваць намаганні на тым, каб усе гэтыя нарматыўныя дакументы працавалі эфектыўна. У гэтым я бачу галоўную задачу членаў Савета Рэспублікі, якія павінны разглядаць дакументы, што прымаюцца, у практычнай плоскасці».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 17°
Віцебск	+ 11°
Гомель	+ 15°
Гродна	+ 16°
Магілёў	+ 13°
Мінск	+ 14°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 26.09.2012 г.

Долар ЗША	8490,00	▲
Еўра	10960,00	▼
Рас. руб.	272,50	▲
Укр. грыўня	1042,74	▲

УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ ПРА КАНТРАКТЫ

25 верасня з 11.00 да 12.00 гадзін у рамках інтэрактыўнага праекта «Online-марафон: Праца і сацыяльная абарона» Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі і БелТА прайшла online-канферэнцыя на тэму: «ЗАКЛЮЧЭННЕ, ЗМЯНЕННЕ, СПЫНЕННЕ ПРАЦОЎНЫХ ДАГАВОРАЎ (КАНТРАКТАЎ)». Адначасова была арганізавана прамая тэлефонная лінія.

Адказы на вашы пытанні далі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Беларусі Ігар СТАРАВОЙТАЎ, начальнік юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна МАСЛОЎСКАЯ, кансультант аддзела працоўнага заканадаўства юрыдычнага ўпраўлення Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Таццяна РАХУБА.

Жалінава Ф.Р., Мінская вобласць: ***Патлумачце, калі ласка, на які тэрмін могуць заключацца працоўныя дагаворы? Першы мой кантракт быў на 2 гады. Калі яго час скончыўся, наймальнік прапанаваў мне на 3 гады (сказаў, што на большы тэрмін нельга ў адпаведнасці з заканадаўствам).***

Валянціна МАСЛОЎСКАЯ: У адпаведнасці з п. 2 арт. 17 Працоўнага кодэкса (ПК) Беларусі працягласць тэрміновага працоўнага дагавора (у тым ліку кантракта) не можа перавышаць пяці гадоў.

Падаўжэнне кантракта ў межах максімальнага тэрміну яго дзеяння ажыццяўляецца па пагадненні бакоў на тэрмін не менш за адзін год. На меншы тэрмін кантракт працягваецца з пісьмовай згоды работніка, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Беларусі.

Прадугледжана заключэнне новага кантракта з работнікам толькі ў двух выпадках:

1) па заканчэнні максімальнага тэрміну дзеяння кантракта;

2) пры пераводзе работніка з яго згоды на іншую працу.

Па заканчэнні максімальнага тэрміну дзеяння кантракта, а таксама ў выпадку пераводу работніка з яго згоды на іншую працу па дамоўленасці бакоў заключаецца новы кантракт на тэрмін не менш за адзін год.

Такім чынам, у вашай сітуацыі наймальнік можа прапанаваць вам падоўжыць кантракт на тэрмін не больш за 3 гады, г.зн. у межах пяцігадовага тэрміну яго дзеяння.

Уладзімір Сімончык, Брэсцкая вобласць: ***Ці разглядаецца пытанне адмены кантрактнай сістэмы ў Беларусі?***

Ігар СТАРАВОЙТАЎ: Сёння такое пытанне ў Рэспубліцы Беларусь не разглядаецца. СТАР 2



Ігар СТАРАВОЙТАЎ і Валянціна МАСЛОЎСКАЯ.



Таццяна РАХУБА.

Фота БЕЛТА.

КАРАТКА

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Расіі Ігар Петрышэнка ўручыць даверчыя граматы прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну. Урачыстая цырымонія адбудзецца ў Крамлі, паведамілі ў прэс-службе беларускага дыппрадстаўніцтва.

Беларусь за студзень-жнівень 2012 года пералічыла ў бюджэт Расіі $2662,2 млн вывазных мытных пошлін на нафтапрадукты, атрыманыя з расійскай нафты. З 2011 года Беларусь імпартуе расійскую нафту бяспошлінна, але пералічвае ў бюджэт Расіі вывазныя мытныя пошліны на нафтапрадукты, выраблены з гэтай вуглевадароднай сыравіны і прададзеныя ў трэція краіны.

Амаль 650 артыстаў задзейнічаны ў Днях культуры Беларусі, якія адкрыліся 24 верасня ў Літве, праінфармаваў міністр культуры Беларусі Павел Латушка на ўрачыстай цырымоніі ў Нацыянальнай філармоніі ў Вільнюсе.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

ІРАН САБРАЎСЯ БАЙКАТАВАЦЬ «ОСКАР» З-ЗА НАШУМЕЛАГА ФІЛЬМА

Улады Ірана заявілі пра намер байкатаваць чарговую прэмію «Оскар» з-за антыісламскага фільма «Нявіннасць мусульман». Пра гэта паведамляе Reuters.

Як заявіў міністр культуры Ісламскай рэспублікі Махамад Хасейні, Іран адмовіцца ад удзелу ў прэміі Амерыканскай кінаакадэміі ў знак пратэсту супраць выхаду «Нявіннасці мусульман», а таксама супраць таго, што арганізатары «Оскара» не выступілі публічна супраць скандальнай карціны. Хасейні таксама заклікаў усе астатнія мусульманскія дзяржавы пайсці на такі ж крок.

Як адзначае Reuters, нягледзячы на наяўнасць цэнзуры ў Іране, кінематаграфічная прадукцыя гэтай краіны на працягу дзесяцігоддзяў шырока вядомая ва ўсім свеце, яе цэняць кінакрытыкі. На 84-й цырымоніі ўручэння «Оскараў» у лютым 2012 года стужка Асгара Фархадзі «Развод Надэра і Сімін» была ўганаравана прэміяй як лепшы фільм на замежнай мове.

Аматарскі фільм «Нявіннасць мусульман», які ў негатыўным святле паказвае прарока Мухамеда, атрымаў шырокую вядомасць у пачатку верасня 2012 года. Стужка стала прычынай масавых антыамерыканскіх дэманстрацый у населеных мусульманамі краінах і нападаў на пасольствы ЗША, якія ў шэрагу выпадкаў прыводзілі да чалавечых ахвяр.

АБАМА ХОЧА НАСТАЎНІЧАЦЬ

Гаспадар Белага дома Барак Абама заявіў, што пасля завяршэння прэзідэнцкай кар'еры хацеў бы вярнуцца да выкладання, паведамляе газета The Times. Заява прагучала падчас запісу інтэрв'ю для перадачы Вупі Голдберг «The View», якая выходзіць на канале ABC. Абама заявіў, што сумуе па рабоце з дзецьмі, аднак хацеў бы застацца прэзідэнтам на другі тэрмін, бо яму яшчэ ёсць чым заняцца ў якасці кіраўніка дзяржавы. У пачатку 1990-х гадоў, пасля заканчэння школы права Гарварда, Абама стаў выкладчыкам аналагічнай школы пры Чыкагскім універсітэце і працаваў там на працягу 12 гадоў. Ён выкладаў канстытуцыйнае права.

ISSN 1990 - 763X

У РАСІІ ЗБІРАЮЦЦА ЎЗМАЦНІЦЬ ПАКАРАННЕ ДЛЯ П'ЯНЫХ КІРОЎЦАЎ

Урачы маюць намер адправіць назад у СІЗА падазраванага па гучнай справе аб гібелі сямі чалавек у ДТЗ на Мінскай вуліцы ў Маскве, паколькі не выявілі ў яго сур'ёзных адхіленняў у стане здароўя, паведаміла РІА.

Раней паведамлялася, што падазраваны па гучнай справе аб гібелі сямі чалавек у ДТЗ 29-гадовы Аляксандр Максімаў шпіталізаваны па медыцынскіх паказаннях у сувязі з траўмамі, атрыманымі ў ДТЗ.

Напярэдадні на судовым пасяджэнні падазраваны прызнаў віну і сам папрасіў заключыць яго пад варту. У выніку суд выканаў пажаданне мужчыны і следства (яно падало хадайніцтва з такім жа патрабаваннем) і арыштаваў яго на два месяцы.

Максімаў у п'яным выглядзе (па папярэдніх звестках, ён выпіў не менш за літр гарэлкі) пратараніў прыпынак грамадскага транспарту на Мінскай вуліцы ў суботу. Ахвярамі ДТЗ сталі сем чалавек, у тым ліку пяцёра выхаванцаў дзіцячага дома-інтэрната. За аварыю яму пагражае да дзевяці гадоў зняволення.

Пасля гэтага ДТЗ зноў загаварылі аб неабходнасці ўзмацніць пакаранне для п'яных кіроўцаў. Дэпутат-адзінарос Шамсаіл Сараліеў, напрыклад, прапануе ўвесці норму, якая ўстанаўлівала б пажыццёвае зняволенне для п'яных кіроўцаў, якія ўчынілі ДТЗ з некалькімі чалавечымі ахвярамі. Пры гэтым ён адзначыў, што ў дадзеным выпадку п'яных за рулём можна прыраўняць да тэрарыстаў.

Ініцыятыву «Адзінай Расіі» па ўзмацненні жорсткасці пакарання для п'яных кіроўцаў падтрымалі ў Белым доме і Крамлі.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПАДАЗРАВАНЫ ПА СПРАВЕ АБ КАНТРАФАКТНЫМ АЛКАГОЛІ Ў ЧЭХІІ ПРЫЗНАЎ ВІНУ

Галоўны падазраваны ў распаўсюджванні кантрафактнага алкаголю ў Чэхіі, што стала прычынай смерці прынамсі 25 чалавек, цалкам прызнаў сваю віну, паведамляе чэшская радыёстанцыя Radio Praha са спасылкай на пракурора горада Злін Рамана Кафку.

Паводле слоў Кафкі, 42-гадовы ўраджэнец горада Астрава прызнаўся яшчэ ў мінулую пятніцу ў тым, што ён і яго саўдзельнік вырабілі вялікую колькасць алкаголю, у склад якога дадавалі метылавы спірт. Па словах падазраванага, яны са змоўшчыкам таксама распаўсюджвалі кантрафактную прадукцыю, арганізаваўшы праз пасярэднікаў пастаўку сумесі метылавага і этылавага спірту на чэшскія лікёра-гарэлачныя заводы.

Як расказаў пракурор Кафка, абодвум мужчынам, якія маюць дачыненне да атручвання людзей, пагражае ад 12 да 20 гадоў турмы. Кіраўнік чэшскай паліцыі Марцін Чарвічак падкрэсліў, што ўсяго на чэшскі рынак трапіла 15 тысяч літраў алкаголю, які змяшчае метылавы спірт, і частка гэтай партыі да гэтага часу не выключаная з абароту.

Міністэрства аховы здароўя Чэхіі 14 верасня цалкам забараніла продаж алкагольных напояў мацункам звыш 20 градусаў на ўсёй тэрыторыі краіны ў сувязі з масавымі атручваннямі метылавым спіртам і гібеллю людзей. Забарона тычыцца продажу алкаголю ва ўсіх крамах і гандлёвых сетках, барах, кафэ, рэстаранах і іншых установах грамадскага харчавання, а таксама гасцініцах. Забаронены продаж алкагольнай прадукцыі праз інтэрнэт.

ЯКУЮ САМУЮ КАШТОЎНУЮ ПАРАДУ ВЫ АТРЫМАЛІ Ў ЖЫЦЦІ?

Вольга ЗАНКОВІЧ, хатняя гаспадыня:

— Самая лепшая парада — не слухаць ніякіх парад. Да гэтага вываду прыйшла сама, выслухаўшы вялікую колькасць самых розных парад. На жаль, ніводная з іх мне ў жыцці не дапамагла.

Хаця... Неяк у цягніку са мной ехаў сівавалосы мужчына інтэлігентнай знешнасці. Мы з ім бавілі час у размовах пра жыццё, і я прызналася яму, што неяк пасаромелася атрымаць патрэбную мне інфармацыю. Ён сказаў мне: «Не ведаць і спытаць — сорам адной хвіліны, не ведаць і не спытаць — сорам усяго жыцця». Я зрабіла з гэтага такую выснову: вучыцца і працаваць над сабой ніколі не позна.

Таццяна БЯЛОВА, мама шасцярых дзяцей:

— Самую каштоўную параду я атрымала ад святога прападобнага Амвросія Опцінскага, прачытаўшыя яго словы: «Жыць — не тужыць, нікога не асуджаць, нікому не дапякаць, і ўсім мая павага».

Не трэба імкнуцца быць добрым для ўсіх і жыць па кімсьці прыдуманых схемах. Кожны павінен шукаць свой шлях. Пры гэтым не варта ўспрымаць гэты шлях занадта сур'ёзна, абавязкова трэба памятаць: самы галоўны чалавек на свеце — той, які перад табой. Я пачынаю цяжкую справу як лёгкую, а лёгкую — як цяжкую, вучуся казаць «не» і стараюся не глядзець на жыццё больш змрочна, чым яно на мяне.

Валерый СПАТКАЙ, пенсіянер:

— Дзесьці я прачытаў, што банк — гэта такое месца, дзе вам абавязкова дадуць грошай у крэдыт, нават калі вы дакажаце, што гэтыя грошы вам не патрэбны!

Возьмеш, напрыклад, 10 мільёнаў беларускіх рублёў у крэдыт на пяць гадоў, і праз «пяцігодку» вернеш у два разы больш. Каштоўнае назіранне, па-мойму.

Падрыхтаваў Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ГРАМАДЗЯН АБАРОНЯЦЬ АД ГУЛЬНЯВОЙ ЗАЛЕЖНАСЦІ

Адпаведны ўказ № 416 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў ва ўказы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 10 студзеня 2005 года № 9 і ад 19 лістапада 2010 года № 599» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 24 верасня, паведамілі БелТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Указам ствараюцца дадатковыя ўмовы абароны грамадзян ад гульнявой залежнасці шляхам увядзення механізму самаабмежавання грамадзян ад удзелу ў азартных гульнях, а таксама замацавання абавязку арганізатараў азартных гульняў забяспечваць праверку дакументаў, якія сведчаць асобу, ва ўсіх наведнікаў ігральных устаноў.

Асаблівае значэнне ў забеспячэнні эфектыўнага кантролю з боку дзяржавы за выкананнем ігральнымі ўстановамі заканадаўчых патрабаванняў, а таксама ў абароне інтарэсаў наведнікаў гэтых устаноў надаецца стварэнню і ўвядзенню ў дзеянне спецыяльнай камп'ютарнай касавай сістэмы. Тэрмін уводу гэтай сістэмы ў дзеянне ўстаноўлены да 1 снежня 2013 года. Дзейнасць арганізатараў азартных гульняў, якія не забяспечаць да названага тэрміну падключэнне абсталявання для гульні да спецыяльнай камп'ютарнай касавай сістэмы, забаронена.

З улікам практыкі ажыццяўлення ігральнага бізнэсу ўказам удакладнены асобныя патрабаванні да ігральных устаноў. Так, выключана патрабаванне аб ізаляванасці памяшканняў, у якіх размяшчаюцца букмекерскія канторы і таталізатары. Прадугледжана магчымасць размяшчэння ў ігральных установах абменных пунктаў, тэрміналаў аўтаматычнага абмену валют, а таксама правядзення культурна-відовішчных мерапрыемстваў і аказання арганізатарамі азартных гульняў паслуг грамадскага харчавання, што дасць магчымасць палепшыць якасць абслугоўвання наведнікаў ігральных устаноў.

Указ прадастаўляе права Міністэрству па падатках і зборах уводзіць для арганізатараў азартных гульняў справаздачнасць аб выніках работы ў сферы ігральнага бізнэсу, а таксама правадзіць разавы збор інфармацыі ў арганізацый, якія ажыццяўляюць дзейнасць у сферы ігральнага бізнэсу, па пытаннях іх дзейнасці ў гэтай сферы.



ЛЯЛЕЧНІКІ «ЎЗЯЛІСЯ» ЗА «ВАР'ЯТА»

Новы будынак віцебскага лялечнага тэатра стане ўнікальным аб'ектам гарадской архітэктуры. А новая пастаноўка віцебскага Беларускага тэатра «Лялька» абяцае стаць сенсацыяй зусім не правінцыйнага маштабу.

Прыемна, што менавіта гэты тэатр плённа супрацоўнічае са «Звяздой»: там праводзілі конкурс юных беларускамоўных паэтаў, конкурс «Казка для Караткевіча», конкурс вырабаў «Мой Анёлак»...

— Цяпер (17-21 верасня) частка трупы тэатра знаходзіцца на планавых гастролях у Сянно, Талачыне, Оршы, гарадскіх пасёлках Барань і Дуброўна са спектаклем «Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурок». У канцы чэрвеня пачалася праца над спектаклем «Нататкі вар'ята» паводле аповесці Гогаля. У цэнтры гэтага спектакля — вар'яцкай фантасмагорыі — чалавек, заціснуты ўмоўнасцямі хворага грамадства і здольны адстаяць чалавечую годнасць толькі коштам свайго жыцця. Галоўныя ролі выконваюць Яўген Гусеў (Аксенцій Іванавіч Папрышчын) і Вольга Лазебная (Сафі), — расказвае мастацкі кіраўнік тэатра «Лялька», Віктар Клімчук, які сёлета быў адзначаны ганаровым званнем «Чалавек года Віцебшчыны» ў сферы культуры. — Дарэчы, гэта ўжо пяты спектакль для дарослых.

А напрыканцы зімы будзе здадзены спектакль «Воўк і казляняты», у якім будуць занятыя маладыя артысты.

У наступным сезоне чакаецца паездка на VI міжрэгіянальны фестываль «Лялькові сустрічі — 2012» у горад Данецк (Украіна). Тэатр удзельнічае таксама ў конкурсе «Нацыянальная тэатральная прэмія» у Мінску са спектаклем «Прынцэса і Свінапас» і ў «Творчай лабараторыі» з прэм'ерным спектаклем «Нататкі вар'ята», паказ якога прызначаны на сакавік наступнага года.

Нагадаем, што Беларускаму тэатру «Лялька» перададзены будынак — помнік архітэктуры на беразе ракі Заходняя Дзвіна, пабудаваны яшчэ ў даваенны час (на вуліцы Энгельса, 2). Нядаўна былі ўскрытыя канверты з распрацаванымі праектамі рэканструкцыі. У хуткім часе будзе аб'яўлены пераможца з лепшым праектам.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне кіраўніку Апарата Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Мартынецкаму Канстанціну Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне кіраўніку Апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Мартынецкаму Канстанціну Аляксеевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.

УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ВЕДАЦЬ ПРА КАНТРАКТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вольга: ***Працую па працоўным дагаворы, заключаным на нявызначаны тэрмін. Падала заяву на звальненне па ўласным жаданні. Наймальнік адмаўляецца падпісаць маю заяву ў сувязі з тым, што няма каму перадаць мае справы. Што мне рабіць у гэтым выпадку, каб звольніцца?***

Валянціна МАСЛОЎСКАЯ: Згодна з арт. 40 Працоўнага кодэкса работнік мае права скасаваць працоўны дагавор, заключаны на нявызначаны тэрмін, папярэдзіўшы аб гэтым наймальніка пісьмова за адзін месяц. Са згоды бакоў і ў выпадках, прадугледжаных у калектыўным дагаворы, працоўны дагавор можа быць скасаваны да заканчэння тэрміну папярэджання.

Работнік мае права да заканчэння тэрміну папярэджання пісьмова адклікаць сваю заяву, калі на яго месца не запрошаны іншы работнік, якому ў адпаведнасці з заканадаўствам не можа быць адмоўлена ў заключэнні працоўнага дагавора.

Пры наяўнасці абставін, якія выключаюць або значна ўскладняюць працяг працы (стан здароўя, пенсійны ўзрост, радыеактыўнае забруджванне тэрыторыі і іншыя выпадкі), а таксама ў выпадках парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага дагавора, пагаднення, працоўнага дагавора наймальнік абавязаны скасаваць працоўны дагавор у тэрмін, указаны ў заяве працаўніка.

Па заканчэнні тэрміну папярэджання работнік мае права спыніць працу. У апошні дзень працы наймальнік абавязаны выдаць работніку працоўную кніжку і ажыццявіць з ім канчатковы разлік. Дарэчы, днём падачы заявы лічыцца дзень яе ўручэння наймальніку, а не дата подпісу.

Месячны тэрмін у дадзеным выпадку з'яўляецца каляндарным, падлік месячнага тэрміну папярэджання пачынаецца з наступнага дня, калі заява была ўручана наймальніку.

Папярэджанне аб маючым адбыцца звальненні павінна быць зроблена толькі пісьмовай заявай і павінна быць падпісана работнікам асабіста.

Калі наймальнік па заканчэнні тэрміну папярэджання не выканаў свае абавязкі па звальненні работніка, то наступае яго адказнасць у адпаведнасці з арт. 78, 79 ПК (выплата сярэдняга заробку за час затрымкі выдачы працоўнай кніжкі і канчатковага разліку). Пры гэтым не мае значэння, што работнік не перадаў свае справы, не здаў матэрыяльныя каштоўнасці, не афармiў абходны ліст і г.д. На вырашэнне гэтых пытанняў быў адведзены адзін месяц.

Такім чынам, па заканчэнні месячнага тэрміну папярэджання наймальнік абавязаны вас звольніць у адпаведнасці з арт. 40 Працоўнага кодэкса па ўласным жаданні.

Алена Мікалаеўна: ***Ці мае права работнік, які дасягнуў пенсійнага ўзросту і працягвае працаваць, патрабаваць датэрміновага скасавання кантракта ў сувязі з выхадам на пенсію ў адпаведнасці з артыкулам 41 Працоўнага кодэкса?***

Ігар СТАРАВОЙТАЎ: У адпаведнасці з арт. 41 Працоўнага кодэкса тэрміновы працоўны дагавор падлягае скасаванню датэрмінова па патрабаванні работніка ў выпадку яго хваробы ці інваліднасці, якія перашкаджаюць выкананню работы па працоўным дагаворы, парушэння наймальнікам заканадаўства аб працы, калектыўнага або працоўнага дагавора і па іншых важных прычынах. Важнымі лічацца такія прычыны як, напрыклад, стан здароўя, выхад на пенсію, змена месца жыхарства, неабходнасць догляду хворых членаў сям'і.

Такім чынам, кантракт з работнікам, які дасягнуў пенсійнага ўзросту, можа быць скасаваны па патрабаванні работніка па ўважлівай прычыне (артыкул 41 Працоўнага кодэкса) у сувязі з выхадам на пенсію.

Мікалай: ***На якіх падставах можа быць звольнены работнік, які працуе на ўмовах сумяшчальніцтва? Ці выплачваецца пры звальненні такога работніка выхадная дапамога?***

Ігар СТАРАВОЙТАЎ: Працоўны дагавор аб рабоце па сумяшчальніцтве можа быць спынены на адной з падстаў, прадугледжаных Працоўным кодэксам і іншымі заканадаўчымі актамі (напрыклад, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.07.1999 г. № 29 «Аб дадатковых мерах па ўдасканаленні працоўных адносін, умацаванні працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны»).

Акрамя таго, для звальнення работнікаў, якія працуюць па сумяшчальніцтве, згодна з арт. 350 Працоўнага кодэкса, акрамя падстаў, прадугледжаных ПК і іншымі заканадаўчымі актамі, працоўны дагавор з такім работнікам можа быць спынены ў выпадку прыёму на працу работніка, для якога гэтая праца будзе з'яўляцца асноўнай.

Выхадная дапамога сумяшчальнікам не выплачваецца (незалежна ад падставы спынення і віду працоўнага дагавора).

(Працяг будзе.)

Падрыхтавала Святлана БУСЬКО.

ЗАВЯРШАЕЦЦА ПАДРЫХТОЎКА ЖЫЛЛЁВА-КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ ДА АСЕННЕ-ЗІМОВАГА ПЕРЫЯДУ

Падрыхтоўка жыллёва-камунальнай гаспадаркі да асенне-зімовага перыяду завяршаецца ў Беларусі, заявіў журналістам кіраўнік Мінжылкамгаса Андрэй Шорац, перадае БелТА.

Учора гэта пытанне разглядалася на пасяджэнні Прэзідыума Саўміна. Як праінфармаваў міністр, падрыхтоўка жыллёва-камунальнай гаспадаркі краіны да асенне-зімовага перыяду вядзецца па плане. На кантролі — 55 розных паказчыкаў, якія штотыднёва разглядаюцца на нарадах у міністэрстве. «Практычна ўсе паказчыкі знаходзяцца ў стадыі завяршэння, да пачатку ацяпляльнага сезона яны ўсе будуць выкананы», — адзначыў ён. У прыватнасці, вядзецца работа па нарыхтоўцы паліва, падрыхтоўцы цеплавых сетак, жыллёвага фонду.

«Усе пашпарты гатоўнасці ў адпаведнасці з распрацаванымі графікамі будуць атрыманы да 15 кастрычніка, — дадаў міністр. — На сёння гэты паказчык у цэлым па рэспубліцы складае 71 працэнт, і ў разрэзе абласцей адзначаецца невялікая палярнасць».

Адказваючы на пытанні журналістаў аб магчымасці пачатку ацяпляльнага сезона раней за запланаваныя тэрміны ў выпадку халоднага надвор'я, Андрэй Шорац адзначыў, што ў бліжэйшы час чакаецца некаторае пацяпленне. «Думаю, што ўключэнне ацяплення аб'ектаў як жылога фонду, так і сацыяльнай інфраструктуры пачнецца планава», — рэзюмаваў ён.

АБЗАЦ

Рэканструкцыю Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў Мінску плануецца завяршыць да канца 2012 года, паведаміў учора журналістам генеральны дырэктар дзяржаўнага вытворчага аб'яднання «Мінскбуд» Мікалай Мілашэўскі. «Робім усе захады, каб здаць аб'ект у тэрмін. Будаўнічыя работы ў самім будынку мы завершым, застанецца толькі ўстанавіць і наладзіць сцэнічнае абсталяванне». На рэканструкцыі заняты амаль 1 тыс. чалавек, работа арганізавана без выхадных і ў тры змены.

Сярэдні заробак у Мінску ў жніўні гэтага года дасягнуў 5 млн 92,9 тыс. рублёў, паведаміла прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Алена Кандраценка. На другой пазіцыі сярод рэгіёнаў па ўзроўні сярэдняй заработнай платы ў жніўні — Мінская вобласць (Br4 млн 246,4 тыс.), на трэцяй — Гомельская вобласць (Br3 млн 864,4 тыс.).

Мінамётныя міны часоў Вялікай Айчыннай вайны выяўлены пры ачыстцы канала Струмень ракі Прыпяць у Тураве Жыткавіцкага раёна. Падчас пад'ёму грунту была знойдзена скрыня з 10 мінамі. Работы праводзіліся паблізу кавярні «Прыпяць». Боепрыпасы вывезены і знішчаны спецыялістамі.

43-гадовы мінчанін адпачываў на пікніку ў лесапаркавай зоне Мядзведжына, дзе знайшоў гранату. І ён не прыдумаў нічога лепшага, як забраць яе з сабой. Аднак па дарозе грамадзянін усё ж сцяміў, што знаходка небяспечная, несці ў кватэру яе не варта. Таму мужчына паклаў гранату ў пакет, а апошні... пад уласны аўтамабіль. Пасля чаго выклікаў міліцыю. Прыбыўшы на месца, праваахоўнікі сапраўды знайшлі пад машынай гранату «Ф-1» часоў Вялікай Айчыннай вайны. Спецыялісты небяспечную знаходку знішчылі.

ПОЎНЫ АБЗАЦ

Жыхар Вялікабрытаніі пабіў сусветны рэкорд — ён надзеў на сябе 302 пары трусоў. 2 гады таму Джорды Пентсмену ўжо ўдавалася трапіць у спіс «самых-самых» на шоу «У Брытаніі ёсць талент». Тады ён надзеў 211 адзінак бялізны. Аднак яго рэкорд хутка пабіла Джанін Кебліш з ЗША. Жанчына нацягнула на сябе 252 пары элегантных трусікаў. 53-гадовы брытанец не засмуціўся і ў сумленным баі адолеў сваю саперніцу. Ён прызнае, што яго хобі нельга назваць лёгкім — даволі складана надзяваць сотні трусоў, калі ўласная вага становіцца ўсё большай.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

КУПІЎ НАЧАЛЬНІК АЎТО...

Нядаўна Прэзідэнт Беларусі казаў пра неабходнасць павышэння памеру сярэдняй заработнай платы ў краіне да ўзроўню 500 долараў у эквіваленце. Між тым, нярэдкія факты, калі кіраўнікі прадпрыемстваў замест таго, каб клапаціцца пра вырашэнне гэтага пытання, купляюць дарагія службовыя аўто ці заказваюць дарагія рамонты ў кабінетах.

— Мы пастаянна адсочваем пытанне своечасовасці выплаты заробкаў. Больш за тое, арганізавана «гарачая лінія», на якую могуць ананімна патэлефанаваць грамадзяне па пытанні выплаты зарплаты, — расказвае Наталля Нікіфарава, начальнік упраўлення Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. — Кожная атрыманая інфармацыя аналізуецца, перапраўраяецца, каб зразумець, ці маюць месца агучаныя факты. Бывае, чалавек тэлефануе і гаворыць, што зарплата выплачваецца несвоечасова, а тэрмін выплаты яшчэ і не наступіў. Сёлета такіх фактаў, каб затрымліваліся зарплату, стала менш, чым летась. Магчыма гэта звязана з тым, што дзяржаўныя органы на месцах працуюць больш мэтанакіравана па гэтым пытанні. Нават без праверкі ў рамках маніторынгу выходзім на кіраўнікоў. Нагадаю, што за затрымку выплаты заработнай платы прадугледжана адміністрацыйная адказнасць — штраф да 20 базавых велічынь. Ёсць факты, калі суб'екты гаспадарання не адлюстроўваюць затрымку зарплаты ў статыстычнай справаздачы. У выніку двух кіраўнікоў вобласці пакаралі за гэтыя парушэнні.

— Кожны факт несвоечасовай выплаты зарплаты расцэньваецца як надзвычайнае здарэнне, — дадае Вадзім Заранкін, першы намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці. — Прымаем меры. У нас ёсць паўнамоцтвы запрошваць інфармацыю нават без праверкі. Устанаўліваем факт — караем. Органы ўлады і суб'екты гаспадарання абавязваем прыняць усе меры каб выплаціць людзям зарплату. Зараз фактаў затрымкі няшмат. А гадоў дзесяць таму своечасовая выплата зарплаты была вялікай праблемай. Нават заводзілі спецыяльныя «карткі» — вялікі архіў такіх неплацельшчыкаў.

Наконт таго, што вяскоўцы атрымліваюць заробак часта напрыканцы месяца, без выплаты авансу, Мікалай Хацкевіч, начальнік упраўлення кантролю за работай аграпрамысловага, лесагаспадарчага і прыродаахоўнага комплексаў Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці, сказаў, што выплачваць заробак вяскоўцам стараюцца да 25-га числа. На жаль, не ўсё так добра як хацелася б, бо ў гаспадарак ёсць абавязкі па раней існуючых крэдытах, даўгах... Таму ў асобных гаспадарках па прычыне адсутнасці крыніц паступлення грошай, выплата заробкаў работнікам зацягваецца. Але гэта не носіць масавы характар, рэгіструюцца рэдкія факты. Крыніцамі выплаты зарплаты, як і ў іншых абласцях краіны, у некаторых выпадках з'яўляюцца авансы перапрацоўчых арганізацый мяса-малочнай галіны.

Што да дарагіх аўто і іншых непершачарговых расходаў, то сёлета падчас маніторынгу высветлілася, што ва Ушацкім раёне новапрызначаны кіраўнік мясцовага райаграсэрвісу, карыстаючыся тым, што ёсць грошы ад рэалізацыі буйной рагатай жывёлы і быў зняты арышт на разліковы рахунак (для выплаты зарплаты), у жніўні купіў аўто «KIA» коштам больш за 200 мільёнаў рублёў. Гэты факт «усплыў». Гаспадарчым судом Віцебскай вобласці на аўто быў накладзены арышт. Далейшы лёс машыны вырашаецца кампетэнтнымі органамі. Кіраўніцтва прадпрыемства за дапушчаныя парушэнні прыцягнулі да дысцыплінарнай адказнасці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗНОЙДЗЕНЫ ПРАДМЕТ, ПАДОБНЫ НА СНАРАД...

У сувязі з масавымі сельскагаспадарчымі работамі за апошні час пачасціліся паведамленні пра магчымыя знаходкі боепрыпасаў часоў Вялікай Айчыннай вайны. Звычайна такая інфармацыя пацвярджаецца, часам людзі памыляюцца...

Так, у пасёлку Калодзішчы Мінскага раёна, на палігоне ў квартале № 723, мінак падчас ранішняй прагулкі ўздоўж дарогі на яе ўзбочыне знайшоў, як потым высветлілася, 122-міліметровы артылерыйскі снарад з узрывальнікам часоў мінулай вайны. Боепрыпас быў знішчаны групай размініравання.

— Прыкладна ў гэты ж час на полі паблізу вёскі Касынь Мінскага раёна таксама быў заўважаны прадмет, падобны на снарад. На месцы група размініравання знайшла пусты корпус 76-міліметровага артылерыйскага снарада часоў Вялікай Айчыннай вайны, — паведамілі ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС.

Увечары наступнага дня пазванілі з пасёлка Калодзішчы-2: пры правядзенні земляных работ на прыватным падворку быў знойдзены прадмет, падобны на снарад. Месца знаходкі, як і ва ўсіх іншых выпадках, ахоўвалі супрацоўнікі міліцыі. На месцы група размініравання ўстанавіла, што знаходка — металічная дэталь ад трактара.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАБ НЕ АБАГНАЦЬ ЖЫЦЦЁ

У Быхаве два чалавекі загінулі ў аварыі.

21 верасня ўдзень «БМВ», якім кіраваў 32-гадовы жыхар райцэнтра, пры абгоне выехаў на сустрэчную паласу і сутыкнуўся з грузавым аўтамабілем. У выніку вадзіцель і 56-гадовы пасажыр загінулі на месцы, а яшчэ адзін пасажыр, 32-х гадоў, дастаўлены з адкрытай чэрапна-мазгавой траўмай у рэанімацыю раённай бальніцы.

— Можа, рызыка і высакародная справа, але толькі не на дарозе! — каментуе інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе Магілёўскай ДАІ Вольга Вяршубская. — Часам вадзіцелі, калі яны выконваюць небяспечны манеўр, не задумваюцца аб наступствах. Упэўнены, што «пераскочаць». А калі не? Будзьце асцярожныя на дарозе пры абгонах.

Ілона ІВАНОВА.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

СЯРЭДНЯЯ ЗАРПЛАТА Ў ЖНІЎНІ СКЛАЛА BR4 МЛН 84 ТЫС. 895

Налічаная сярэдняя заработная плата работнікаў Рэспублікі Беларусь у жніўні гэтага года склала Br4 млн 84 тыс. 895, паведамілі БелТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце. Гэты паказчык у ліпені гэтага года быў Br3 млн 925 тыс. 900. Налічаная сярэдняя заработная плата рабочых і служачых у жніўні гэтага года склала Br4 млн 102 тыс. 996 (у ліпені 2012 года — Br3 млн 944 тыс. 259).

СЕНАТАРЫ — ЛЮДЗІ ВЯДОМЫЯ

Фота БЕЛТА.

У Магілёве 25 верасня абралі членаў Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу.

Восем сенатараў будуць прадстаўляць рэгіён у верхняй палаце беларускага парламента. Гэта вядомыя ў Магілёўскай вобласці людзі: старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік, генеральны дырэктар ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» Валерый Іваноў, старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Панцюхоў, дырэктар ЗАТ «Палітэкс» Віталь Кастагораў, дырэктар Бабруйскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага мастацкага каледжа Ніна Касцян, галоўны ўрач Кіраўскай цэнтральнай раённай бальніцы Алена Круцько, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта Ігар Марзалюк, дырэктар ААТ «Агракамбінат «Усход» Магілёўскага раёна Віктар Пінчук.

Ул. інф.

ПАЖЫЛЫ РЫБАК ЛЕДЗЬ НЕ ПАТАНУЎ З ЛОДКАЙ

У Гомелі работнікі МНС выратавалі рыбака, які ледзьве не патануў на пашкоджанай гумавай лодцы.

Пра тое, што на востраве пасярэдзіне вадаёма ў раёне вуліцы Лепяшынскага знаходзіцца чалавек і яму патрэбна дапамога, увечары выратавальнікам паведаміў відавочца. На месцы высветлілася, што 70-гадовы жыхар абласнога цэнтра падчас рыбалкі пашкодзіў гумавую лодку. На пашкоджаным і часткова затопленым плавальным сродку ён здолеў дабрацца да бліжэйшага вострава. Пацярпелага пераправілі на бераг, дзе яго агледзелі медыкі. Апошнія паставілі дыягназ «агульнае пераахаладжэнне». Пасля аказання першай медыцынскай дапамогі мужчына самастойна пайшоў дадому.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНТРАБАНДНЫЯ ШПАЛЕРЫ НА 2,7 МІЛЬЯРДА

Шпалеры італьянскай вытворчасці агульным коштам 2,7 мільярда рублёў незаконна ўвезлі ў Беларусь з Літвы.

— У суправаджальных дакументах было ўказана, што вязуць танную плёнку, а фактычна везлі шпалеры, — расказвае Аляксандр Юркевіч, выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Віцебскай вобласці. — Іх кантрабандысты планавалі рэалізаваць у Расійскай Федэрацыі. Спробу незаконнага правозу праз нашу краіну тавара-матэрыяльных каштоўнасцяў спынілі. Зараз вядзецца адміністрацыйны працэс. Накіраваны запыты ў Літву і Расію. У перспектыве шпалеры трапяць у даход дзяржавы.

Зламыснікі пайшлі на аферу, каб зэканоміць на мытных пошлінах. У дэпартаменце не выключаюць, што гіганцкая партыя шпалераў магла быць з Расіі. А гаспадары шпалераў у выніку пазбеглі б выплаты падаткаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗЛАЧЫНЦА ЗАТРЫМАНЫ, ДАРАГІ БРАНЗАЛЕТ — ЗНОЙДЗЕНЫ

Праз месяц пасля крадзяжу залатога бранзалета коштам больш за 12,5 мільёна рублёў з ювелірнай крамы па вуліцы Камсамольскай у сталіцы злачынца быў затрыманы. Ім аказаўся неаднаразова судзімы 42-гадовы жыхар Віцебска, які выйшаў на волю ў лютым бягучага года.

Нагадаем, што зламыснік зайшоў у ювелірную краму і, выбраўшы момант, пры дапамозе тонкага металічнага дроту выцягнуў залаты бранзалет з падстаўкі на вітрыне. Гандлёвая зала абсталявана камерай відэаназірання, аднак устанавіць асобу злачынцы па атрыманых кадрах здымкі з-за адсутнасці нейкіх асаблівых прыкмет было праблематычна. І тым не менш, супрацоўнікі крымінальнага вышуку Цэнтральнага РУУС г. Мінска здолелі затрымаць грамадзяніна. Дарэчы, падчас першага догляду ў падазронага быў знойдзены бранзалет, які аналагічным чынам быў выкрадзены з іншай ювелірнай крамы. Затрыманы не стаў адмаўляць сваёй прыналежнасці да крадзяжу з крамы па вуліцы Камсамольскай. Высветлілася, што дарагую рэч ён прадаў на адным з рынкаў гандляру агароднінай усяго за адзін мільён рублёў. Практычна ўсе гэтыя грошы пайшлі на набыццё наркотыкаў. Дарэчы, была ўстаноўлена і асоба пакупніка залатога вырабу. Бранзалет у яго канфіскавалі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ На здароўе!

СТАРАЯ НОВАЯ БАЛЬНІЦА

Жыхары Шаркаўшчыны і ўсяго раёна зусім хутка змогуць атрымліваць медыцынскія паслугі ў новым будынку раённай бальніцы. Цікава, што старая бальніца знаходзіцца на тэрыторыі былой панскай сядзібы. Вядома, вельмі прыемна бачыць на фасадзе аднаго з яе карпусоў, што гэты будынак ахоўваецца дзяржавай як помнік архітэктуры пачатку XX стагоддзя. Але ж як лячыць і лячыцца ў бальніцы, якая не адпавядае часу?

Галоўны ўрач Шаркаўшчынскай раённай бальніцы Станіслаў СТОМА.

Гісторыя даўгабуда

Будаўніцтва раённай бальніцы на 165 ложкаў з паліклінікай (на 200 наведванняў у змену) было распачата яшчэ ў 1997-м.

Адпаведнай праграмай, зацверджанай Віцебскім аблвыканкамам, была (далей цытата): «выдзелена першая чарга будаўніцтва на 130 ложкаў, у складзе якой быў запланаваны наступны набор структурных падраздзяленняў: палатны корпус, дыягнастычны корпус, трансфарматарная падстанцыя, харчовы блок...»

Напрыканцы 2002-га ўвялі ў эксплуатацыю так званы пускавы комплекс бальніцы (дыягнастычны корпус, у якім размешчана паліклінічнае аддзяленне і аперацыйна-рэанімацыйны блок, інжынерныя сеткі.

Паводле распараджэння тагачаснага губернатара Віцебшчыны, члены рабочай групы правялі рэвізію праектна-каштарыснай дакументацыі па аб'екце — з мэтай скарачэння кошт будаўніцтва напалову... Адным з захадаў было памяншэнне колькасці месцаў у палатным корпусе.

З 2003-га, пасля таго, як аб'ект выключылі з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмы, будаўніцтва на час спынілі.

У 2007-м выконваліся работы па будаўніцтве станцыі газазабеспячэння, у наступным будавалі харчовы блок і палатны корпус...

Цяпер будаўнічыя работы практычна завершаны.

Першыя ў раёне... ліфты

— Медыкі будуць працаваць на новым эндаскапічным абсталяванні, ультрагукавым апараце з сучаснай перадавой прыстаўкай. Раней з-за яе адсутнасці хворых даводзілася накіроўваць у Віцебск. Дарэчы, бальніца поўнасцю ўкамплектавана так званымі вузкімі спецыялістамі, — расказвае Станіслаў Стома, галоўны ўрач Шаркаўшчынскай цэнтральнай раённай бальніцы. Ён — мясцовы жыхар, рэаніматолаг з хірургічнай спецыялізацыяй. Узначальвае калектыў бальніцы 11 гадоў, а ўсяго ў бальніцы працуе 17 гадоў. — Усё неабходнае абсталяванне ёсць і для радзільнага аддзялення. Між іншым, летась у раёне прынялі больш за 190 родаў — за апошнія 12 гадоў самы высокі паказчык, і сёлета ён не паніжаецца. І самае, бадай, галоўнае, што ўсе аддзяленні нарэшце будуць пад адным дахам. А які харчовы блок! Хворыя кажуць, што пасля працірачнай машыны вельмі смачнае пюрэ атрымліваецца. Ёсць у харчовым блоку і параканвектар, якога мы раней ніколі не бачылі, таму ледзь ім навучыліся карыстацца. І цяпер пацыенты атрымліваюць мясныя стравы, прыгатаваныя на пары. Будзе свая «пральня» з сучаснай машынай. Ды што там казаць, у будынку ёсць нават ліфты — адзіныя ў раёне (!): пасажырскі і два грузавыя...

Паводле слоў начальніка ўпраўлення аховы здароўя Віцебскага аблвыканкама Юрыя Дзеркача, менавіта гэтая бальніца — адзін з самых грунтоўных праектаў па паляпшэнні медыцынскага абслугоўвання, якія рэалізуюцца на Віцебшчыне.

— Былі даручэнні Прэзідэнта аб тым, што да 2013 года трэба прывесці ў парадак усе аб'екты аховы здароўя. І апошнія тры гады на Віцебшчыне вядзецца актыўная мадэрнізацыя, рэканструкцыя і будаўніцтва такіх аб'ектаў. Сёлета практычна завершаны работы на 40 з іх, — гаворыць Юрый Дзяркач. — Каля 40 засталося здаць пад ключ у адпаведнасці з планам, які прыняў аблвыканкам. Менавіта Шаркаўшчынская цэнтральная раённая бальніца — адзін з найбольш сур'ёзных аб'ектаў, як і бальніца ў Мёрах, дзе будаўніцтва было запланавана каля 20 гадоў таму! У 2009 годзе было прынята рашэнне аб працягу работ.

Новы будынак раённай бальніцы.

Стары будынак раённай бальніцы.

Сучасныя ўмовы для работы спрыяюць і замацаванню кадраў. Калі прадастаўляць жыллё і магчымасць развівацца, напрыклад, да ўзроўню ўрача першай катэгорыі, маладыя медыкі будуць заставацца ў глыбінцы.

І тут лечаць...

Не мог не пабачыць на свае вочы старую бальніцу, якая штогод прымала 3,5 тысячы пацыентаў. Будынкі стаяць на адлегласці адзін ад другога. Каб зрабіць, напрыклад, флюараграфію, трэба пераходзіць з аднаго ў іншы. А калі ўльтрагукавое даследаванне патрэбна цяжкаму хвораму, даводзіцца «грузіць» апарат і везці да пацыента. Хірургія і аперацыйная — на 2-м паверсе, рэанімацыя — на 1-м. Пасля аперацыі хворага кладуць на насілкі і нясуць... А ўявіце, як «прыемна» зімой дзяжурнаму ўрачу ісці, напрыклад, з хірургіі ў тэрапію, дзіцячае або радзільнае аддзяленні.

Нягледзячы на тое, што новая бальніца яшчэ не запрацавала, са старой маладыя ўрачы не звальняліся. Сакрэт у тым, што райвыканкам заўсёды ідзе насустрач калектыву бальніцы. Работнікі забяспечваюцца асобным жыллём з колькасцю пакояў, якая патрэбна, зыходзячы са складу сям'і. У доме пасля капітальнага рамонту медыкам выдзелена пяць кватэр. Хто хоча жыць асобна, атрымліваюць катэджы з цэнтралізаванымі газіфікацыяй і водазабеспячэннем усяго ў 1,5 кіламетра ад бальніцы (ужо ёсць некалькі такіх катэджаў).

— Вось да нас тры гады таму прыйшоў працаваць хірург — ён ужо загадчык аддзялення. Два гады таму прыйшлі трое маладых тэрапеўтаў — нашы жыхары, і яны засталіся тут. У штаце толькі тры пенсіянеры, — кажа Станіслаў Стома.

Старая бальніца будзе выкарыстоўвацца ў якасці бальніцы сястрынскага догляду — там знойдуць часовы прытулак пажылыя людзі.

У помніку архітэктуры на тэрыторыі старой бальніцы думаюць зрабіць музей. А вось што рабіць, напрыклад, з хірургічным аддзяленнем, пабудаваным у 1975 годзе, дзе няма вентыляцыі, — пытанне застаецца адкрытым.

Цікава, што на тэрыторыі старой бальніцы ў 1970-я заклалі сад яблынь. Дагледаюць іх медыкі. Здаюць яблыкі, сушаць іх для хворых... Каля 40 дрэў у гэтым садзе. Але ў адрозненне ад вядомага твора Чэхава, ён нікому не перашкаджае. Кажуць, у гэтым садзе незвычайныя яблыкі — з'еў і памаладзеў, сілы адразу прыбавіліся. А ўсё таму, што медыкі ўкладваюць у сад часцінку сваёй душы. Як і ў лячэнне пацыентаў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота аўтара.

Шаркаўшчына — Віцебск

БЛАКІТ І ЦІШЫНЯ

За 10 кіламетраў ад раённага цэнтра Клімавічы ў Магілёўскай вобласці знаходзіцца маляўнічае месца, якое называюць Блакітным кар'ерам.

Гэта нібыта «маленькая Швейцарыя», месца адпачынку знаўцаў мясцовай прыроды. Няма ніякіх указальнікаў на шашы, але калі ў патрэбным месцы звярнуць, то праз некалькі метраў з вышыні абрыву адкрываецца цудоўны від на сажалку з няроўнымі берагамі, зарослымі дрэвамі, астравамі і неверагодна яркай, блакітна-бірузовай вадой.

— Гэта кар'ер, у якім здабывалі мел гадоў 30 таму, — растлумачыў кіраўнік раённай структуры Беларускага таварыства рыбаловаў і паляўнічых Аляксандр Асмалоўскі. — А потым на дне забілі крынічныя ключы, і кар'ер напоўніўся вадой. Вада, дарэчы, тут вельмі добрая, і такі колер мае з-за мелу. Мелавыя адкладанні — натуральны прыродны фільтр для вады. Глыбіня кар'еру няроўная: даходзіць у некаторых месцах аж да 15 метраў.

Аляксандр Асмалоўскі найперш паведамляе інфармацыю для рыбакоў: у кар'еры добра прыжыліся карп, лешч, рачны сом. Людзі тут актыўна ловяць рыбу, а таксама і ў суседніх кар'ерах. Бо ўвогуле Блакітны кар'ер — толькі адзін з 13-ці ў цэлай чарадзе, але, безумоўна, самы прыгожы.

У Клімавіцкім раёне мяркуюць, што каля Блакітнага кар'ера можна зрабіць выдатнае месца адпачынку. Добраўпарадкаваць пляжную зону, пабудаваць некалькі вялікіх вальераў для звяроў — накшталт заапарка, арганізаваць рыбалку. Аднак на ўсё гэта патрэбны грошы, і не малыя, таму тут чакаюць інвестараў.

Пакуль жа кар'ер стаіць у некранутым (так бы мовіць) выглядзе і радуе вока. Гавораць, што ён вялікай папулярнасцю карыстаецца ўлетку і, натуральна, у спякоту. Аднак і цяпер, ранняй восенню, пейзаж проста неверагодны. Навокал воднай гладзі ўсіх адценняў сіняга плямы бела-бэжавых мелавых берагоў, а ў зеляніне лісця дрэў ужо з'явіліся жоўтыя і чырвоныя колеры. Падчас пераменнай воблачнасці сонца прарываецца праз шэрыя аблокі і высвечвае два востравы ўсярэдзіне кар'ера. Прырода і чалавек разам стварылі сапраўды незвычайнае месца. Прыгажосць, якая захапляе. І цішыня навокал, якая супакойвае.

Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.

Клімавіцкі раён.

НАБЫЎ ПІСТАЛЕТ І... РАССТРАЛЯЎ МАШЫНУ

Хаця гаворка ідзе пра «пнеўматыку», за свой учынак жыхар Гродзенскай вобласці рызыкуе пазбавіцца волі на дзесяць гадоў.

— У сталіцу 25-гадовы грамадзянін прыехаў да свайго знаёмага з канкрэтнай мэтай: набыць у саслужыўца апошняга пнеўматычны пісталет, — паведамілі ў прэс-службе ГУУС Мінгарвыканкама. — Сустрэчу прызначылі на стаянцы аднаго з мінскіх прадпрыемстваў па вуліцы Чыгуначнай. Прадавец атрымаў запрошаныя 150 долараў, пакупнік — жаданую «пнеўматыку». Пасля здзелкі ўжо колішні ўладальнік зброі і яго калегі пайшлі ў размешчанае побач памяшканне склада. А новы гаспадар пісталета вырашыў выпрабаваць яго на... прыпаркаваным на стаянцы «Фордзе Мандэа». У машыну маладзён выпусціў некалькі куль, разбіўшы задняе шкло і пашкодзіўшы стойкі. Зламысніка затрымалі і перадалі міліцыі нядаўнія партнёры па здзелцы, якія пачулі стрэлы. Падчас разбору здарэння стралок заявіў, што, маўляў, уладальнік транспартнага сродку — дрэнны чалавек і павінны быць пакараны. Аднак пацярпелы сказаў, што ніколі не быў знаёмы з жыхаром Гродзенскай вобласці і не ведае прычын, па якіх той расстраляў яго машыну. Зламыснік змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання. Калі яго дзеянні будуць кваліфікаваныя па артыкуле «Хуліганства», яму можа пагражаць да дзесяці гадоў пазбаўлення волі.

НАЧНАЯ ЭВАКУАЦЫЯ З ІНТЭРНАТА

У Маладзечна ноччу адбыўся пажар у інтэрнаце дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання парашковай металургіі, які месціцца па вуліцы Янкі Купалы. Амаль у 5 гадзін раніцы па лініі «101» пра здарэнне паведаміла яго жыхарка.

Задымленне было ў адным з жылых блокаў на 6-м паверсе 9-павярховага панэльнага будынка інтэрната. Гаспадыня блока разам з сям'ёй на момант пажару знаходзілася на дачы. Прыступіўшы да тушэння пажару, работнікі МНС па лесвічных маршах з вышэйразмешчаных паверхаў эвакуявалі 40 чалавек. У выніку пажару агнём была пашкоджана драўляная шафа ў вітальні блока. Пацярпелых не было. Адсяляць жыльцоў таксама няма неабходнасці. Прычына пажару высвятляецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ «Салодкія» перспектывы

ЛЕПШЫ ВЫНІК НА ТЫХ ЖА ПЛОШЧАХ?

Калі збожжаўборачная тэхніка ўжо «адпачывае», дык на цукровабурачных палетках гарачыя дзянькі толькі пачынаюцца. Біялагічныя тэрміны саспявання караняплодаў і назапашвання цукру яшчэ не самыя лепшыя, але, тым не менш, у інтарэсах перапрацоўчых прадпрыемстваў уборка традыцыйна пачынаецца раней за аптымальны перыяд. Цукровыя камбінаты, так бы мовіць, у даўгу не застаюцца: каб кампенсаваць натуральныя страты гаспадарак у цукрыстасці караняплодаў, з 1 па 20 верасня прадугледжана 20-працэнтная надбаўка да гранічных мінімальных цэн. Ёсць цэнавая надбаўка і за позднія тэрміны.

Дзяржаўны заказ Гродзеншчыне па цукровых бураках сёлета складае 1425 тон — гэта найвышэйшы паказчык сярод усіх абласцей краіны. А ўжо ў бліжэйшай перспектыве перад аграрнікамі рэгіёна, верагодна, будзе пастаўлена яшчэ больш напружаная задача ў сувязі з намерамі па павелічэнні экспартнага патэнцыялу цукру. Калі сёлета на нашых перапрацоўчых прадпрыемствах чакаецца выпуск 600 тысяч тон, то ў 2015 годзе — 720 тысяч тон. За кошт чаго? Шляхам павелічэння цукровабурачных плошчаў?

Сваімі думкамі на гэты конт з карэспандэнтам «Звязды» падзяліліся кіраўнікі некаторых сельгаспрадпрыемстваў, дзе паспяхова займаюцца гэтай культурай.

— Як ставіцеся да стварэння сумеснай беларуска-расійскай кампаніі вытворцаў цукру, каб не канкураваць паміж сабой, а аб'яднаць намаганні па павелічэнні экспарту за межы Мытнага саюза? — цікаўлюся ў старшыні СВК «Свіслач» Гродзенскага раёна Васіля ГУСТЫРА.

— Любое супрацоўніцтва толькі на агульную карысць. У тым ліку, зразумела, і на карысць сельгасвытворцаў, паколькі цукровыя буракі — культура вельмі выгадная, з добрай рэнтабельнасцю. Калі браць сёлетнія закупачныя цэны, то яны па цукровых бураках вышэйшыя нават, чым на бульбу для прамысловай перапрацоўкі. Калі такое было?

Праўда, задача павелічэння аб'ёмаў сыравіны для цукровай прамысловасці (прынамсі, у нашых умовах, калі ўжо дасягнута добрая ўраджайнасць) даволі праблематычная. Справа ў севазвароце: у тым жа месцы цукровыя буракі могуць знаходзіцца праз чатыры гады на пяты. Таму ў нашай гаспадарцы пад іх можа быць занята не больш за 10 працэнтаў ворнай зямлі. Зрэшты, пэўныя рэзервы ёсць. У прыватнасці, як выбраць найлепшае насенне? Бярэм некалькі гатункаў і доследным метадам іх параўноўваем, выбіраючы аптымальны для нашых умоў.

Што датычыцца тэхнікі, то яна адпавядае сучасным патрабаванням. Праўда, уся тэхніка імпартная, запчасткі вельмі дарагія. Зрабіць беларускі буракаўборачны камбайн было б, безумоўна, больш прывабна. Толькі б пазбегнуць праблем з яго якасцю.

Кааперацыю беларускіх і расійскіх вытворцаў цукру падтрымлівае і старшыня СВК імя Варанецкага Бераставіцкага раёна Іосіф КОЛАС:

— Галоўнае, каб былі рынкі збыту. Сёння мы маем квоту па здачы прадукцыі на Скідальскі цукровы камбінат. Так, за апошнія гады ён значна павялічыў свае магутнасці, але ж яны не бязмежныя. Таму калі ў вобласці пабудуюць яшчэ адно перапрацоўчае прадпрыемства, можна будзе і нарошчваць вытворчасць цукровых буракоў. Культура гэтая сапраўды вельмі выгадная.

Праўда, не ў кожнага, а ў сапраўдных прафесіяналаў. Старшыня СВК «Шчучынагрупрадукт» Барыс КУЦ лічыць вельмі важнай спецыялізацыю гаспадарак у цукровабурачнай галіне:

— У сувязі са спецыфікай севазвароту мы не можам павялічыць плошчы пад цукровыя буракі, аднак ужо стабільна, з году ў год атрымліваем належную ўраджайнасць, цукрыстасць, высокую рэнтабельнасць. Чаму? Таму, што пастаянна ўдасканальваем селекцыю, своечасова і якасна выконваем усе тэхналагічныя патрабаванні, думаем, як скараціць затраты.

Пры гэтым і Барыс Куц, і яго калегі адзначылі як безумоўны «плюс» цеснае партнёрства з перапрацоўшчыкамі цукровых буракоў.

Гэта пацвердзіў і першы намеснік старшыні камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванні Гродзенскага аблвыканкама Сяргей ШЭЎЧЫК:

— Сапраўды, сельгаспрадпрыемствы са Скідальскім цукровым камбінатам працуюць у тандэме. Перапрацоўшчыкі закупляюць для гаспадарак насенне, тым самым авансуючы іх, часткова дапамагаюць сродкамі аховы раслін. За апошнія гады камбінат значна пашырыў свае магутнасці, палепшыў умовы для захоўвання сыравіны, дзякуючы чаму на палях ужо не сустрэць пасыпаных вапнай буртоў з цукровымі буракамі, якія доўга чакалі перапрацоўкі.

Разам з тым, актуальным з'яўляецца пытанне будаўніцтва на тэрыторыі Гродзеншчыны яшчэ аднаго цукровага камбіната. Разглядаюцца пляцоўкі ў Дзятлаўскім раёне альбо ў паўночным рэгіёне вобласці. З улікам другога прадпрыемства, зразумела, на парадку дня з'явіцца пытанне павелічэння дзяржзаказу і пашырэння плошчаў пад цукровыя буракі. Пры гэтым стаўка павінна рабіцца не проста на павелічэнне тэрыторый, а найперш на іх эфектыўнае выкарыстанне. Што відавочна ўжо цяпер: аб'ёмы плошчаў пад гэту культуру ў вобласці на працягу шэрагу гадоў застаюцца практычна аднолькавымі (каля 35 тысяч гектараў), але аддача ўсё павялічваецца. Вось канкрэтныя лічбы: у 2000 годзе сярэдняя ўраджайнасць па вобласці складала 340 цэнтнераў з гектара, у 2006-м — 407, а летась — ужо 504 ц/га. Прычым гэта зусім не падстава для нейкай эйфарыі, заспакаення на дасягнутым: перадавыя гаспадаркі і нават некаторыя раёны ў цэлым ужо стабільна дасягаюць і значна лепшых вынікаў. З іншага боку, шмат дзе яшчэ не да канца адпрацавалі тэхналогію, адсюль і значнае адставанне ад лідараў.

Такім чынам, рэзервы росту ёсць нават на цяперашніх цукровабурачных плошчах. Прычым не толькі ў павышэнні ўраджайнасці, але і, галоўнае, у назапашванні цукровасці. Вынік, зноў жа, залежыць ад граматнага выкарыстання сучасных тэхналогій. Гэта датычыцца і ўнясення ўгнаенняў, сістэмы аховы раслін, апрацоўкі супраць хвароб, каб прадоўжыць вегетацыйны перыяд зялёнага лісця, ад чаго залежыць развіццё караняплодаў і іх цукровасць. Дарэчы, з перадавым вопытам у гэтай і іншых сферах сельскагаспадарчай вытворчасці галоўным аграномам сёлета можна будзе азнаёміцца падчас двухтыднёвай вучобы на базе Гродзенскага аграрнага ўніверсітэта.

Барыс ПРАКОПЧЫК

■ Зачапіла

ЗА ШТО КРЫЎДЗЯЦЬ СВЯТОЕ ВОЗЕРА?

Святое возера ў Салігорскім раёне — адзін з нешматлікіх прыродных вадаёмаў краіны, назва якіх — «Святое» — узята пад ахову дзяржавы, і возера з'яўляецца цэнтрам гідралагічнага заказніка.

Іх безліч, падобных адно да аднаго, маленькіх лясных азёраў з балоцістымі берагамі! Наогул, з дзесяці тысяч беларускіх вялікіх і малых вадаёмаў толькі крыху больш за дзясятак «прылічаны да ліку святых». А гэтае званне, як вядома, проста так не надавалі ні людзям, ні абразам, ні, тым больш, прыродным аб'ектам.

Цэлы шэраг забарон, накіраваных на захаванне салігорскай прыроднай святыні ў яе першапачатковым стане, пералічана на ахоўным шчыце, усталяваным на падыходзе да вадаёма. У тым ліку і пра тое, што побач з возерам нельга распальваць агонь, знішчаць расліннасць і капаць глебу, разбіваць турыстычныя лагеры... Але, нібы ў піку гэтым папярэджанням, некаторыя наведнікі робяць усё наадварот, цынічна пакідаючы сведчанні «высокакультурнага» баўлення часу. Цікава, ці быў аштрафаваны работнікамі аховы навакольнага асяроддзя хоць адзін з тых, хто ўчыняе на беразе шумныя папойкі і пакідае смецце. Ці быў папярэджаны хоць хто-небудзь з парушальнікаў: ад Старобінскага лясгаса, у чыім ведамстве знаходзіцца возера, да гэтага аб'екта не так і далёка. Ды штосьці не верыцца, што такое магчыма. Гэткіх выпадкаў у Беларусі, бадай, яшчэ не было. Таму і красуе на берагах рэк і азёраў смецце.

Чарговы раз завітаўшы на бераг Святога возера за салігорскай вёскай Саковічы, убачыўшы шматлікія кучы непрыхаванага смецця, узгадалася колішняе англійскае выслоўе: калі англічанін прыходзіць у лес — лес становіцца чысцейшым. Не хочацца праводзіць паралеляў, але, на жаль, па-нашаму гэта гучыць наадварот...

Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.

БЕЛАРУС ХОЧА ПУБЛІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ

Інстытут парламентарызму — вельмі важны аспект дэмакратыі. Прадстаўнічыя органы кіравання — аснова любой сучаснай дзяржавы. Часам ад людзей можна пачуць: «І што ад таго парламента? Яны ж там нічога не робяць». Але гэта крыўднае недаацэньванне працы заканадаўчай улады. Мы ўсе жывём па тых законах, якія выпрацоўвае менавіта парламент. Іншая справа, што ў кожнай краіне парламентарызм набывае нейкія нацыянальныя адметнасці. Выклікана гэта тым, што амаль на працягу ўсёй сваёй гісторыі любая краіна ішла асаблівым шляхам. Традыцыі, гісторыя накладаюць пэўны адбітак на ўсё: і на народ, і на тое, як ён сябе арганізоўвае. Менталітэт — гэта падсвядомае. Гэта архетып. Яго нельга не ўлічваць. А як беларускі менталітэт суадносіцца з парламентарызмам? На гэтае пытанне спрабавалі адказаць эксперты падчас «круглага стала», што быў арганізаваны ў дзень выбараў новага беларускага парламента.

У НАС НЕ ПАЛІТЫЧНАЯ, А ПРАЦОЎНАЯ НАЦЫЯ

«Ёсць некаторыя аксіёмы, якія выпрацаваны сусветнай палітычнай навукай: ніхто не валодае манаполіяй на дэмакратыю: дэмакратыя — гэта не тавар, які можна экспартаваць ці імпартаваць. Гэта асновы разумення палітычнага працэсу на постсавецкай прасторы», — упэўнены

Леў КРЫШТАПОВІЧ, намеснік дырэктара Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ён жа сцвярджае, што да аналізу палітычнага працэсу нельга падыходзіць праз прызму пэўнай метадалогіі: «Я называю гэты метад сафістыкай. Сэнс яго не ў падсвядомым скажэнні палітычнай рэчаіснасці, а ў тым, што аргументацыя ідзе па прынцыпе пошуку прыкладаў «за» ці «супраць» нейкай з'явы. Напрыклад, парламенцкія выбары. Мы можам прыводзіць масу станоўчых аргументаў: што яны дэмакратычныя; што яны адпавядаюць палітычнаму працэсу, нашай ментальнасці. Іншыя пачнуць называць прыклады супрацьлеглага кшталту: сумненні з пункту гледжання міжнародных стандартаў і гэтак далей. Журналісты працуюць часцей за ўсё ў парадыгме такой сафістыкі, калі знаходзяць ці станоўчыя, ці адмоўныя бакі. Але гэта не дае існага разумення палітычнага працэсу. Таму я думаю, што нашы выбары трэба ацэньваць не праз прызму міжнародных стандартаў, а ўлічваючы культурныя традыцыі і гістарычныя факты. Мадэль дэмакратыі павінна вызначацца мясцовымі ўмовамі, фактарамі. І наш парламент насамрэч у нейкай ступені адлюстроўвае беларускую ментальнасць — ён спакойны і ціхі, як і мы самі. Наша нацыя ў пэўнай ступені не палітычная, а хутчэй працоўная. Таму так цяжка ў нас прабіцца кудысьці прафесійным палітыкам — больш шанцаў у звычайнага працаўніка. Наша ментальнасць і ёсць аснова легітымнасці нашага парламента». Адным словам, дэмагогам, якія карысталіся вялікай папулярнасцю ў Старажытнай Грэцыі, у Беларусі жыць цяжкавата.

МЕНТАЛІТЭТ КАПІРАВАННЮ НЕ ПАДДАЕЦЦА

Пётр НІКІЦЕНКА, акадэмік НАН Беларусі, доктар эканамічных навук, прафесар, выказаў свае меркаванне: «Як мы глядзім на свет, так мы і бачым сваё месца ў гэтым найскладанейшым, супярэчлівым, спекулятыўна-фіктыўным свеце, дзе мы знаходзімся ў доларавым і тэхналагічным каланіялізме. Сёння самая галоўная ўлада ў свеце — канцэптуальная, светапоглядная. Яна нават наддзяржаўная. Таму фарміраванне пэўнага светапогляду ў народа — галоўны фактар выжывальнасці ў сучасным свеце. Менталітэт нельга з кагонебудзь скапіраваць».

Падобнай думкі прытрымліваецца і **Аляксандр КАВАЛЕНЯ, акадэмік-сакратар Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі:** «Мы такія, якія мы ёсць. Ні лепшыя, ні горшыя. На працягу нашага шматвяковага гістарычнага шляху мы перажылі больш за 90 войнаў, ваенных канфліктаў і паўстанняў. І ў бліжэйшай перспектыве (10-20-30 гадоў) мы не станем ні немцамі, ні англічанамі, ні французамі. У нас іншыя каштоўнасці. І ісці па чужых сцэнарах мы не можам праз свае псіхалагічна-нацыянальныя адметнасці».

Збольшага, можа, і я згодны з такімі тэзісамі. Хоць бы ў тым, што наракаць на дрэнную ўладу можна толькі пасля таго, як паглядзіш на самога сябе. Мы любім наракаць на сваё начальства, але забываем, што ўсе начальнікі выходзяць з народа (маецца на ўвазе ўсё наша грамадства). Таму наракаць трэба перш-наперш на сябе... Гэта, вядома, я вельмі ўтрыраваў агучваную праблему наконт менталітэту, але сэнс застаецца той жа: мы і ўсё, што мы ствараем, мае выключна нашы асаблівасці. Не хачу сказаць, што ў нас дрэнная ментальнасць. Наадварот. Яна ў нас выдатная. Як беларус, я сцвярджаю, што мы найлепшы народ. Але многія спрабуюць зламаць існае і навязваць новае. Мы і самі да сябе ўжо не вельмі падобныя: жывём па законах спажывальніцтва, чым беларусы ніколі не займаліся. З гэтым трэба нешта рабіць. Калі ў нас ёсць нейкія праблемы, то яны ўнутры. Заўвагі звонку могуць быць слушнымі, але зусім бездапаможнымі.

НОВЫ ПАРЛАМЕНТ СУТЫКНЕЦЦА З СУР'ЁЗНЫМІ ВЫКЛІКАМІ

«Насамрэч у бок нашага парламентарызму часам гучыць шмат крытыкі, якая звязана з не вельмі вялікай роляй парламента, з нецікавай выбарчай кампаніяй... Але трэба прызнаць, што пэўная палітычная традыцыя ў Беларусі ўжо склалася, і яна не такая і дрэнная. Праз мажарытарную сістэму існуе канкрэтная сувязь паміж выбаршчыкам і дэпутатам, — разважае **Юрый ЦАРЫК, кіраўнік Грамадскага прэс-цэнтра Дома прэсы.** — Але сёлета ў нас з'явіліся і навацыі — правядзенне дэбатаў падчас выбараў. Рэч толькі ў тым, што калі гадоў пяць таму крытыка ўлады сама па

сабе магла прадстаўляць нейкую праграму (чалавек мог выйсці на экран і пачаць крытыкаваць уладу — і на гэтым атрымаць сур'ёзны палітычны капітал), то зараз дэбаты праходзілі інакш. На крытычных спекуляцыях ужо не атрымалася нічога зарабіць. Гэта важная прыкмета эвалюцыі нашай палітычнай культуры. Крытыка ўлады больш не з'яўляецца палітычнай праграмай у Рэспубліцы Беларусь. Каб мець поспех на палітычным полі, трэба ўжо прапаноўваць пазітыўную праграму».

Вось і атрымалася, што ад палітычных партый у новы парламент прайшлі толькі 5 чалавек. І гэты парламент, па словах Юрыя Царыка, сутыкнецца з сур'ёзнымі выклікамі: хутчэй за ўсё, будзе непазбежнай другая хваля глабальнага фінансава-эканамічнага крызісу; інтэграцыйныя працэсы (верагодна, давядзецца падпісваць дагавор аб стварэнні Еўразійскага эканамічнага саюза); роля прыватнага сектара ў эканоміцы будзе павялічвацца.

НЕАБХОДНА, КАБ ПАЛІТЫКА БЫЛА ПУБЛІЧНАЙ

Зыходзячы з двух фактаў («наш парламент вельмі спакойны» і «ў парламента будзе шмат сур'ёзных выклікаў»), «Звязда» задала экспертам пытанне: ці здолее спакойны парламент добра абмеркаваць важныя праблемы і прыняць правільнае рашэнне? «Мне здаецца, што толькі спакойны парламент і можа прыняць правільнае рашэнне», — адразу сказаў Леў Крыштаповіч. Кіраўнік грамадскага прэс-цэнтра даў такі адказ: «Так, шоу ў парламенце ў нас не атрымліваецца. Але насамрэч дыскусіі ідуць вельмі востра. Іншая справа, што па традыцыі ўсе абмеркаванні праходзяць у камісіях, а пасля дэпутаты выходзяць і прымаюць рашэнні. Я згодны, што экспертнае, аналітычнае забеспячэнне працы парламентарыяў трэба павялічваць. Пытанні, якія абмяркоўваюцца ў кулуарах, павінны перад гэтым прагаворвацца публічна».

Аляксандр ДАШКЕВІЧ, кандыдат гістарычных навук, дацэнт, лічыць так: «Сапраўды, беларускі менталітэт вельмі спагадлівы, спакойны. Але любы народ развіваецца, развіваецца палітычная сістэма. У гэтым кантэксце мы павінны глядзець і на сённяшні беларускі парламентарызм. Неабходна развіваць грамадзянскую супольнасць. Палітычныя партыі ў нас не працуюць. Але што мы хочам бачыць далей? Мы зацікаўлены ў развіцці інстытута партый? Я мяркую, што зацікаўлены. І ўмовы для таго ствараюцца. Але ці скарыстаўся хто-небудзь імі? І гэтыя зняцці сваіх кандыдатур... Гэта ж проста падман выбаршчыкаў. Партыі патрэбны. Хоць бы для таго, каб ажыццяўляць рэкрутынг моладзі».

Наўздагон пытанню «Звязды» прагучала пытанне **палітычнага аналітыка Аляксея МАЦЭВІЛЫ:** «Ёсць папулярнае ў заходняй палітычнай культуры меркаванне: сучасная публічная палітыка — гэта, у першую чаргу, шоу. І на яго ёсць попыт з боку грамадства. Аднак, з аднаго боку, перадвыбарчыя дэбаты кандыдатаў у прэзідэнты ЗША і іншых буйных палітыкаў насамрэч збіраюць тэлевізійную аўдыторыю, якую можна супаставіць з футбольнымі матчамі і канцэртамі сусветных зорак. З іншага боку, заходні выбаршчык усё часцей скардзіцца, што калі справа даходзіць да прыняцця рашэнняў, вакол якіх няма яркай карцінкі, але якія закранаюць яго штодзённыя інтарэсы (напрыклад, па закрыцці вытворчасцяў, дазволу на стварэнне геннамадыфікаванай прадукцыі і гэтак далей), то па гэтых пытаннях не толькі няма выразнага супрацьстаяння паміж асноўнымі палітычнымі сіламі, але, больш за тое, ёсць спроба адысці ад нейкай пазіцыі. Атрымліваецца, што выбаршчыкі чакаюць вырашэння канкрэтных вострых пытанняў, вакол якіх таго самага палітычнага шоу не адбываецца. А чаго хоча беларускі выбаршчык?» Юрый Царык, не вагаючыся, адказаў: «Беларусы хочуць абмяркоўваць палітыку. На мой погляд, ім гэтага не хапае. Таму метазаказ ёсць. Але ў гэтым заказе трэба бачыць жаданне прадметна абмяркоўваць канкрэтныя пытанні і знаходзіць адказы для таго, каб разумець, што будзе адбывацца праз пяць гадоў, прагназаваць сваю будучыню. Беларуская традыцыя ў гэтым сэнсе: палітыка павінна быць публічнай, з народам павінны раіцца».

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

НАЗІРАЛЬНІК З БЕЛЬГІІ:

«ПАДЧАС ПАДЛІКУ ГАЛАСОЎ УСЁ БЫЛО ВІДАЦЬ»

Член Канстытуцыйнага суда Бельгіі Жан-Поль Маерман назірае за выбарамі ў Беларусі чацвёрты раз. Ён падзяліўся сваімі ўражаннямі з журналістам газеты «Звязда» ў Інфармацыйным цэнтры ЦВК.

«З кожным маім прыездам мне здаецца, што выбарчы працэс арганізуецца ўсё лепш і лепш, — расказаў спадар Маерман. — Наша задача — ацаніць выбары падчас асноўнага дня галасавання, ускрыцця скрынь з бюлетэнямі і падліку галасоў. Таму ў мяне няма ўяўлення пра тое, як праходзіла перадвыбарная гонка. Але я чуў, што апазіцыя вырашыла байкатаваць выбары, і думаю, што гэта — памылка. Дэмакратыя будуецца ўсімі членамі грамадства. У Бельгіі ёсць шмат маленькіх партый, якія не маюць шанцаў быць выбранымі, але калі ніколі не ўдзельнічаць у выбарчым працэсе, то шанцу і не з'явіцца».

Перамогі на выбарах дабіваюцца не ў дзень выбараў, а шляхам штодзённага ўдзелу ў жыцці і палітыцы сваёй краіны, дадаў замежны назіральнік. Толькі такім чынам насельніцтва можа скласці рэальнае ўяўленне пра годнасць кожнага кандыдата.

У назіральніка з Бельгіі няма негатыўных заўваг адносна матэрыяльнай часткі арганізацыі выбараў і іх арганізацыі. «На мой погляд, усё прайшло добра, — сказаў ён і ўдакладніў: — Тут я не кранаю палітычную частку пытання».

Адзіная заўвага, з якой пагаджаецца Жан-Поль Маерман: назіральнікам варта было дазволіць станавіцца бліжэй да месца, дзе адбываецца падлік галасоў. Гэта не азначае, што ўчастковыя камісіі мелі магчымасць для фальсіфікацыі, хутчэй назіральнікі адчувалі псіхалагічны дыскамфорт.

— Усе аперацыі праводзіліся перад назіральнікамі так, што, калі і не было відаць дэталяў, але маніпуляцыі па выніках галасавання былі немагчымыя, — патлумачыў бельгійскі суддзя. — З іншага боку, калі б усе прысутныя наблізіліся да стала, дзе ішла апрацоўка бюлетэняў, гэта таксама стварыла б дыскамфорт. Так адбываецца ў Бельгіі, дзе праблемы ўзнікаюць не з боку членаў камісіі, а з боку некаторых празмерна актыўных назіральнікаў, якія перашкаджаюць працэсу падліку галасоў.

Нягледзячы на пэўную дыстанцыю, назіральнікі мелі магчымасць бачыць усё, падкрэсліў спадар Маерман. «Пытанне ў тым, што чалавек заўсёды ў нечым сумняваецца. Гэта можа быць і добра, інакш журналістам не было б працы», — засмяяўся ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Фота БЕЛТА.

110-га вылучым потым

Галасаванне на Гомельшчыне ў гэтую нядзелю прайшло больш чым на тысячы выбарчых участкаў. 76,6% жыхароў паўднёва-ўсходняга рэгіёна Беларусі прыйшлі зрабіць свой выбар сярод кандыдатаў у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу пятага склікання.

У Гомельскай вобласці на 17 дэпутацкіх мандатаў прэтэндавалі 45 кандыдатаў. Па дзвюх з 17 акруг — Гомельскай-Сельмашаўскай №32 і Гомельскай-Навабеліцкай №36 выбары дэпутатаў праходзілі на безальтэрнатыўнай аснове, бо ў бюлетэнях на выбарчых участках у гэтых акругах было толькі па адным прозвішчы. Урэшце ў апошняй акрузе дэпутат не быў выбраны, бо за кандыдата не прагаласавала абсалютная большасць выбаршчыкаў. У сувязі з гэтым акругу чакаюць паўторныя выбары. Хутчэй за ўсё, яны будуць сумешчаныя з выбарамі дэпутатаў мясцовых Саветаў.

Колькасць прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты ў іншых акругах складала ад двух да чатырох. У Гомельскай вобласці за ходам выбараў ажыццяўлялі назіранне каля 5 тысяч чалавек, у тым ліку каля 40 міжнародных назіральнікаў. У сярэднім на кожны выбарчы ўчастак прыпадала па 5 назіральнікаў. Падчас правядзення галасавання ў вобласці працавалі місіі назіральнікаў ад АБСЕ і Выканаўчага камітэта СНД.

Старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік падчас свайго галасавання на выбарчым участку №27 па Гомельскай-Цэнтральнай выбарчай акрузе №33 падкрэсліў, што новы парламент абавязкова павінен прыбавіць у сваёй рабоце ў параўнанні з парламентам папярэдняга склікання:

— Я аддаў перавагу кандыдату ў дэпутаты, які зможа ўнесці свой уклад ў паляпшэнне работы парламента, а таксама здольны ажыццявіць шмат карыснага для Гомельшчыны і краіны.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Рэйтынгі і прагноз па рэйтынгах Беларусі па выніках парламенцкіх выбараў засталіся нязменнымі

Служба крэдытных рэйтынгаў Standard & Poor's заявіла аб тым, што суверэнныя крэдытныя рэйтынгі і прагноз па рэйтынгах Беларусі (B-/Стабільны/B) засталіся нязменнымі па выніках парламенцкіх выбараў. Такая інфармацыя змяшчаецца ў прэс-рэлізе S&P, паведамляе БЕЛТА.

У міжнародным рэйтынгавым агенцтве Standard & Poor's чакаюць, што курс беларускага ўрада застанецца нязменным і вынікі выбараў не паўплываюць на планы ўрада ў сферы эканомікі. «На гэты момант эканамічныя паказчыкі сведчаць, што беларуская эканоміка прадаўжае стабілізавацца», — адзначылі ў S&P.

У ліпені 2012 года Standard & Poor's павысіла кароткатэрміновы суверэнны крэдытны рэйтынг Беларусі па абавязацельствах у замежнай і нацыянальнай валюце з «C» да «B». Доўгатэрміновыя рэйтынгі былі пацверджаны на ўзроўні «B-», прагноз стабільны.

МІСІЯ НАГЛЯДАЛЬНІКАЎ АБСЕ ТАК І НЕ ЗМАГЛА АБСТРАГАВАЦЦА АД ПАЛІТЫЗАВАНЫХ АЦЭНАК ВЫБАРАЎ

Місія наглядальнікаў АБСЕ, як і ў папярэднія гады, не змагла цалкам абстрагавацца ад палітызаваных ацэнак і вывадаў, якія не маюць непасрэднага дачынення да выбарчага працэсу. Такое меркаванне змяшчаецца ў каментарыі начальніка ўпраўлення інфармацыі — прэс-сакратара МЗС Беларусі Андрэя Савіных па папярэдніх выніках міжнароднага назірання за выбарамі дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі пятага склікання, паведамляе БЕЛТА.

23 верасня 2012 года ў Беларусі прайшлі парламенцкія выбары. У адпаведнасці з волевыяўленнем беларускага народа і ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам выбраны новы беларускі парламент, канстатуецца ў каментарыі.

«Беларускі бок загадзя запрасіў міжнародных наглядальнікаў і забяспечыў усе неабходныя ўмовы для іх эфектыўнай работы. У міжнародным назіранні за парламенцкімі выбарамі прынялі ўдзел амаль 800 наглядальнікаў, уключаючы місіі ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў і Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Міжнародным наглядальнікам была прадастаўлена магчымасць атрымаць поўную і дакладную інфармацыю па ўсіх аспектах выбарчай кампаніі, якія іх цікавілі», — адзначае Андрэй Савіных.

Беларускі бок азнаёміўся з папярэднімі вывадамі і ацэнкамі наглядальнікаў ад СНД і АБСЕ, агучанымі 24 верасня, сказана ў каментарыі.

«Вітаем збалансаваную і аб'ектыўную ацэнку місіі СНД, якая правяла значную работу па маніторынгу выбарчага працэсу ў Беларусі. Выказваем шкадаванне ў сувязі з тым, што місія наглядальнікаў АБСЕ, як і ў мінулыя гады, не змагла цалкам абстрагавацца ад палітызаваных ацэнак і вывадаў, якія не маюць непасрэднага дачынення да выбарчага працэсу», — канстатуе Андрэй Савіных.

«Разам з тым адзначаем заяўленую кіраўніцтвам місіі гатоўнасць да ўзаемадзеяння з Беларуссю, што адпавядала б нашым агульным інтарэсам. Падкрэсліваем, што дыялог і супрацоўніцтва, а не націск і санкцыі, даюць магчымасць рухацца наперад па пытаннях, якія адпавядаюць інтарэсам як самой Беларусі, так і нашых партнёраў», — сказана ў каментарыі прадстаўніка МЗС Беларусі.

■ Інтэграцыя

А ЦІ ПАТРЭБНА СТВАРАЦЬ ЕЎРАЗІЙСКІ ПАРЛАМЕНТ?

Чым хутчэй Беларусь, Расія і Казахстан набліжаюцца да стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза, тым часцей гучаць заклікі з боку розных палітыкаў і экспертаў, галоўным чынам расійскіх, аб неабходнасці ўтварэння новага наднацыянальнага заканадаўчага органа — Еўразійскага парламента. На сённяшні дзень ужо створана працоўная група ў складзе прадстаўнікоў парламентаў Беларусі, Расіі і Казахстана, у кампетэнцыі якой знаходзіцца распрацоўка канцэпцыі фарміравання еўразійскага парламенцкага органа. Тым не менш, у ідэі стварэння Еўразійскага парламента ёсць і свае скептыкі, а мэтазгоднасць рэалізацыі гэтай ініцыятывы зусім не відавочная.

Першым аб магчымасці стварэння новага парламенцкага вымярэння еўразійскай эканамічнай інтэграцыі загаварыў прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў. У сваім артыкуле «Еўразійскі саюз: ад ідэі да гісторыі будучыні» ён выказаў думкі наконт стварэння наднацыянальнай структуры, якая будзе аб'ядноўваць парламентарыяў Беларусі, Расіі і Казахстана — Еўразійскай асамблеі.

У хуткім часе гэтая ідэя была падхоплена старшынёй Дзяржаўнай думы Расійскай Федэрацыі Сяргеем Нарышкіным, які прапанаваў не абмяжоўвацца толькі Еўразійскай асамблеяй, а стварыць паўнавартасны Еўразійскі парламент па прыкладзе Еўрапарламента. На яго думку, стварэнне да 1 студзеня 2015 года Еўразійскага эканамічнага саюза патрабуе сур'ёзнай перабудовы ўсяго комплексу міжпарламенцкага ўзаемадзеяння. Ён таксама падкрэсліў, што гэтая задача не можа быць вырашана адразу і прадугледжвае паэтапнае пераўтварэнне Міжпарламенцкай Асамблеі ЕўрАзЭС у Еўразійскую Міжпарламенцкую Асамблею, а затым — у паўнавартасны Еўразійскі парламент. Плануецца, што палажэнне аб Еўразійскім парламенце павінна будзе ўвайсці ва Усёабдымны дагавор аб Еўразійскім эканамічным саюзе, які набудзе сілу 1 студзеня 2015 года.

Таму менавіта тэма стварэння парламенцкага органа Еўразійскага эканамічнага саюза з'яўлялася галоўнай на нарадзе рабочай групы па пытаннях парламенцкага вымярэння еўразійскай эканамічнай інтэграцыі, якая адбылася 13 верасня ў Маскве. Рабочая група павінна была вызначыцца, ці будзе Еўразійскі эканамічны саюз мець паўнавартасны парламенцкі орган, сфарміраваны на падмурку прамых выбараў, або парламенцкую асамблею, у якую дэлегуюцца дэпутаты ад парламентаў трох краін. Вынікамі нарады павінны былі стаць праект палажэння аб працоўнай групе па пытаннях парламенцкага вымярэння еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і праект мемарандума аб канцэпцыі фарміравання еўразійскага парламенцкага органа.

Але найбольш цікавым вынікам стаў рэзананс у казахскім істэблішменце і экспертнай супольнасці. Сакратар кіруючай у Казахстане партыі «Нур Атан» Ерлан Карын заявіў, што ідэя стварэння Еўразійскага парламента нерэальная ні ў бліжэйшай, ні ў сярэднетэрміновай, ні нават у далёкай перспектыве. Працягваючы сваю думку, ён выказаў слушнае меркаванне наконт таго, што стварэнне наднацыянальнай палітычнай структуры наогул не можа абмяркоўвацца Казахстанам, бо гэта наўпрост закранае прынцып суверэнітэту краіны, замацаваны ў Канстытуцыі, і, больш за тое, згодна з ёй, такога роду пытанні нават не могуць выносіцца на агульнанацыянальны рэферэндум.

На самой справе, пакуль што зусім не зразумела, якімі функцыямі будзе валодаць Еўразійскі парламент. Сяргей Нарышкін, напрыклад, прапануе надзяліць яго заканадаўчымі і кантрольнымі паўнамоцтвамі па аналогіі з Еўрапейскім парламентам. Але праблема ў тым, што Еўрапейскі саюз — гэта не толькі эканамічная, але і палітычная адзінка, у адрозненне ад будучага Еўразійскага эканамічнага саюза, які ўяўляе сабой інтэграцыйную эканамічную адзінку.

На сённяшні дзень ужо існуе спецыяльны орган, які займаецца менавіта эканамічным вымярэннем еўразійскай інтэграцыі ў межах Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы. Гэта Еўразійская эканамічная камісія, у кампетэнцыі якой знаходзяцца пытанні рэалізацыі міжнародных дамоў, якія складаюць дагаворна-прававую базу Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, і прывядзенне нацыянальных заканадаўстваў у адпаведнасць з імі. Таксама трэба адзначыць, што Еўразійскі эканамічны саюз ствараецца па нормах і правілах функцыянавання Сусветнай гандлёвай арганізацыі, а далучэнне Беларусі, Расіі і Казахстана да гэтай Арганізацыі з'яўляецца галоўным прыярытэтам, таму, па сутнасці, нацыянальныя заканадаўствы прыводзяцца ў адпаведнасць з нормамі і правіламі СГА.

У гэтым кантэксце стварэнне Еўразійскага парламента выглядае немэтазгодным, бо цяжка сабе ўявіць, што еўразійскія парламентарыі будуць займацца кадыфікацыяй міжнародных дагавораў. А як толькі Еўразійскі парламент пачне прэтэндаваць на тое, каб рэалізоўваць палітычныя функцыі, гэта аўтаматычна пераўтворыць Еўразійскі эканамічны саюз у палітычную адзінку, што прадугледжвае дэлегаванне значнай часткі нацыянальных палітычных паўнамоцтваў наднацыянальным палітычным інстытутам і, як вынік, прывядзе да абмежавання дзяржаўнага суверэнітэту.

Таму цалкам можна пагадзіцца з меркаваннем памочніка прэзідэнта Казахстана па палітычных пытаннях Ермухамета Ертысбаева наконт таго, што стварэнне Еўразійскага парламента пакуль што заўчаснае, бо спачатку трэба наладзіць сур'ёзную працу ў межах Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

Пакуль асноўная праблема будучага Еўразійскага эканамічнага саюза складаецца ў адсутнасці праекта інтэграцыі. Больш-менш скаардынаванае ўступленне Расіі, Казахстана і Беларусі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю не з'яўляецца сапраўдным праектам (зрэшты, у СГА можна было б уступаць і паасобку). Таму, калі Еўразійскі эканамічны саюз жадае адбыцца як канкурэнтнае інтэграцыйнае аб'яднанне, ужо зараз трэба весці гаворку не пра тое, як фарміраваць Еўразійскі парламент і спрачацца наконт месца яго размяшчэння (у Астане ці Санкт-Пецярбургу), а ствараць такія карпаратыўныя і дзяржаўна-карпаратыўныя структуры, якія напоўняць праект еўразійскай інтэграцыі.

З улікам гэтага сёння больш надзённая задача — стварэнне Еўразійскага кангрэса прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў, а таксама заснаванне Еўразійскай гандлёва-прамысловай палаты, як гэта прапанаваў Нурсултан Назарбаеў.

Акрамя таго, варта весці гаворку аб стварэнні Еўразійскай карпарацыі развіцця, якая займалася б распрацоўкай і рэалізацыяй прарыўных інжынерных і навукова-тэхнічных інавацыйных праектаў, якія запатрабуюць новыя тыпы навукі, адукацыі, падрыхтоўкі кадраў, сістэм кіравання і прыняцця рашэнняў і г.д.

Само па сабе зняцце мытных і іншых бар'ераў паміж краінамі будучага Еўразійскага эканамічнага саюза, ні, тым больш, уключэнне еўразійскай прасторы ў рэжым функцыянавання Сусветнай гандлёвай арганізацыі не створыць станоўчага эфекту развіцця нашых грамадстваў, а наадварот, ва ўмовах надыходзячай другой хвалі сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу можа прывесці да дэградацыі.

Выйсце — у пераўтварэнні еўразійскай прасторы ў прастору тэхналагічнага і інавацыйнага развіцця. Вось пра гэта, лічу, ужо зараз трэба весці сур'ёзную размову, а не пра стварэнне адзінага еўразійскага парламента, вярхоўнага ўрада, адзінай валюты і да таго падобнае.

Арсеній СІВІЦКІ, палітычны аналітык, магістрант факультэта філасофіі і сацыяльных навук БДУ

■

■ Цэны

МЕТАЛЫ ЗНОЎ «ЗВАРУХНУЛІСЯ»

Згодна з пастановай Міністэрства фінансаў, з 24 верасня ў краіне ўводзяцца новыя цэны на каштоўныя металы ў вырабах і ломе (акрамя куплі-продажу банкаўскімі і нябанкаўскімі крэдытна-фінансавымі арганізацыямі каштоўных металаў у выглядзе мерных зліткаў і манет у фізічных асоб). Апошні раз дагэтуль яны змяняліся з 1 чэрвеня, перад тым — з 1 мая.

Цяпер скупачныя цэны ў рублях за грам металу выглядаюць так. На золата ў вырабах і ломе: 375-й пробы — 144 000 рублёў (дагэтуль з 1 чэрвеня дзейнічала цана ў памеры 128 210 рублёў за той жа грам); 500-й пробы — 192 000 рублёў (170 950 рублёў); 583-й і 585-й пробы — 224 640 рублёў (200 010 рублёў); 750-й пробы — 288 000 рублёў (256 430 рублёў); 900-й пробы — 345 600 рублёў (307 710 рублёў); 916-й пробы — 351 740 рублёў (313 180 рублёў); 950-й пробы — 364 800 рублёў (324 810 рублёў); 958-й пробы — 367 870 рублёў (да нядаўняга часу было 327 540 рублёў за адзін грам металу).

Скупачная цана на плаціну ў вырабах і ломе з вышэйназванай даты наступная: 950-й пробы — 336 060 рублёў за адзін грам металу (апошняя цана дагэтуль — 301 320 рублёў).

Змяніліся і скупачныя цэны на серабро ў вырабах і ломе. За адзін грам металу ў рублях па пробах з 24 верасня: 750-й пробы — 5 480 рублёў (дагэтуль было 4 600 рублёў); 800-й пробы — 5 840 рублёў (4 910 рублёў); 875-й пробы — 6 390 рублёў (5 370 рублёў); 916-й пробы — 6 690 рублёў (5 620 рублёў); 925-й пробы — 6 760 рублёў (5 680 рублёў); 960-й пробы — 7 010 рублёў за адзін грам металу (да нядаўняга часу было 5 890 рублёў за той жа грам).

Сяргей СТАРЫНАЎ

■

■ Падпіска-2012

«МАЁ ЖЫЦЦЁ БЕЗ ГАЗЕТЫ СТАНЕ ЗУСІМ НЕ ЦІКАВЫМ»

ЛІСТ...

«Добры дзень, шаноўная «Звязда»! З вялікай просьбай да цябе звяртаецца пастаянная чытачка. 64 гады я рэгулярна падпісвалася на сваю любімую газету, на «Звязду», а вось зараз, мусіць, прыйдзецца з ёй расстацца. Атрымала пенсію, але ж купіла дроў, заплаціла за газавы балон, за святло, тэлефон. Грошы засталіся толькі на прадукты, якія цяпер, на вялікі жаль, зусім не танныя. Да таго ж свайго ў мяне анічога няма, апроч бульбы. Значыць, трэба купляць і заставацца без падпіскі на чацвёрты квартал.

Я — пенсіянерка, інвалід другой групы. Даходаў ніякіх не маю, фізічна працаваць не магу. Мне 85 гадоў. Жыву ў вёсцы, адна. Так што газету я вельмі чакаю, чытаю, і без яе маё жыццё стане зусім не цікавым.

Спадзяюся, што вы зразумееце мяне і не адмовіце. Загадзя ўдзячна.

П.М., *Мядзельскі раён*

...І КАМЕНТАРЫЙ

Пад гэтым пісьмом, ну вядома ж, ёсць подпіс, ёсць поўны зваротны адрас. І рэдакцыя (не маючы магчымасцяў дапамагчы), гатова паведаміць іх чалавеку (свет не без добрых людзей, праўда?), які захоча і зможа афармiць падпіску не толькі сабе...

Чым, вядома ж, парадуе нашу адданую чытачку, зробіць яе (і сваё) жыццё цікавейшым. Тэлефануйце 287 18 64.

■ Крымінал, здарэнні

Начная дарога небяспечная

У Магілёўскім раёне ў ДТЗ загінулі два чалавекі.

Усё пачыналася з радаснай падзеі: у вёсцы Трылесіна Дрыбінскага раёна сабралася вялікая сям'я. Свята і застолле завяршыліся позна ўвечары, госці дадому не спяшаліся, бо быў і аўтамабіль, і вадзіцель. Праўда, на той момант ніхто не ўлічыў, што ў маладога чалавека зусім малы вопыт кіравання — крыху болей за паўгода. Паводле інфармацыі Магілёўскай ДАІ, каля поўначы 14 верасня паблізу вёскі Сухары Магілёўскага раёна вадзіцель страціў кантроль над аўтамабілем на закругленні дарогі, «Фальксваген» з'ехаў у кювет, некалькі разоў перакуліўся і збіў жалезабетонную апору лініі электрапередач.

— Аднаго з пасажыраў выкінула з мікрааўтобуса, — паведаміла інспектар аддзялення па агітацыі і прапагандзе абласной ДАІ Таццяна Старасотнікава. — Але мужчына сур'ёзна не пацярпеў. Два чалавекі ў аўтамабілі засталіся жывымі — сам вадзіцель і 15-гадовы падлетак. Два мужчыны, 40 і 55 гадоў, загінулі на месцы. Удар аб слуп трапіў па іх, і траўмы аказаліся несумяшчальнымі з жыццём. Гэта вялікае гора для сям'і, і кіроўцу давядзецца адказаць перад законам.

Ілона ІВАНОВА.

Сын абвінавачваецца ў забойстве маці

Крымінальная справа па абвінавачанні 24-гадовага жыхара адной з вёсак Чэрвеньскага раёна ў катаванні і забойстве маці накіравана ў Мінскі абласны суд. Паводле слоў намесніка начальніка аддзела прокуратуры Мінскай вобласці Таццяны НАХОДКІ, малады чалавек, знаходзячыся нападпітку, больш як 40 разоў ударыў сваю 55-гадовую маці нагамі і дзяржальнам швабры, у тым ліку па галаве і грудной клетцы. У выніку жанчына загінула на месцы здарэння. Нагодай для забойства паслужылі словы пра тое, што яна не ведае, дзе знаходзіцца набытая сынам бутэлька гарэлкі. Як высветлілася, хлопец і да гэтага няшчасця неаднаразова падымаў на маці руку.

Забілі, каб не плаціць за праезд

Пракуратура Мінскай вобласці падтрымала дзяржаўнае абвінавачанне па крымінальнай справе аб забойстве мінскага таксіста ў снежні 2011 года ў п. Калодзішчы Мінскага раёна. Паводле слоў пракурора аддзела пракуратуры Мінскай вобласці Алесі ЖАВАРАНАК, злачынства здзейснілі па папярэдняй змове, каб пазбегнуць аплаты за праезд, двое раней судзімых мінчан, 23 і 34 гадоў. Яны задушылі таксіста шпагатам, а таксама нанеслі яму нажавыя раненні і ўдары рукамі і нагамі па розных частках цела. Труп пакінулі ў лесе, а аўтамашыну і іншую маёмасць пацярпелага выкралі. Мінскі абласны суд прызнаў маладых людзей вінаватымі і прысудзіў па сукупнасці злачынстваў да 24 і 25 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Надзея ДРЫЛА.

Невядомы парашок у канверце нарабіў перапуду

Канверт з невядомым рэчывам быў выяўлены ў Салігорску: у доме па праспекце Міру грамадзянін бліжэй да абеду ў сваёй паштовай скрыні знайшоў адпраўленне без зваротнага адраса, унутры якога знаходзіўся празрысты пакецік з невядомым белым парашком і надпісам «Споры сібірскай язвы». — На месца прыбыла няштатная хімічная служба Салігорскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, міліцыя, брыгада хуткай медыцынскай дапамогі. Пад'езд дома быў ачэплены, доступ у кватэру абмежаваны, — распавялі падрабязнасці ў цэнтры прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС. — Работнікі дзяржаўнай установы «Салігорскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» пакецік з невядомым рэчывам упакавалі ў кантэйнер і накіравалі ў мікрабіялагічную лабараторыю ў Слуцк. Была праведзена санітарная апрацоўка трохпакаёвай кватэры і пад'езда дзевяціпавярховага дома дэзынфікуючым сродкам. Гаспадар жылля 1943 года нараджэння і яго на тры гады маладзейшай жонка былі дастаўлены ў інфекцыйнае аддзяленне Салігорскай цэнтральнай раённай бальніцы для абследавання. Паводле слоў галоўнага ўрача дзяржаўнай установы «Салігорскі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі», папярэднія даследаванні знойдзенага парашка паказалі, што спор сібірскай язвы не выяўлена. Разгорнуты вынік будзе гатовы ў бліжэйшы час.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Зняў кватэру і абрабаваў гаспадыню

У Віцебску 22-гадовы малады чалавек зняў кватэру на суткі і... вынес адтуль сучасны тэлепрыёмнік і мікрахвалевую печ. Грошай гаспадыня кватэры ў якасці платы за пражыванне так і не атрымала. Скрадзены тэлевізар злодзей здаў у ламбард. Калі з ім паспрабавала выйсці на сувязь падманутая гаспадыня кватэры, мабільны тэлефон хлопца быў па-за зонай доступу... Праз некалькі месяцаў гэты ж хлопец «узяў касу» крамы папулярнай у Віцебску гандлёвай сеткі «Віцебскія прадукты». Жанчына-касір чакала інкасатара, а замест апошняга з'явіўся малады чалавек з нажом у руках, стаў патрабаваць грошы. У выніку адабраў 27,5 мільёна рублёў. — Падчас расследавання крымінальнай справы маці рабаўніка часткова кампенсавала страту краме — у памеры 15 мільёнаў рублёў... Прыгаворам суда за ўчыненыя крадзеж і разбойны напад злодзея пазбавілі волі тэрмінам на 7 гадоў, — расказаў Аляксандр Дзядзюра, памочнік пракурора Кастрычніцкага раёна Віцебска. — З канфіскацыяй маёмасці і адбываннем пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму. Акрамя гэтага, ён абавязаны кампенсаваць маральную шкоду касіру крамы — 5 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

«Каратнула» электраправодку тэлевізара...

Удзень пра дым, які ішоў з кватэры на 8-м паверсе 9-павярховага жылога дома ў Мінску па вуліцы Ротмістрава, паведамілі суседзі.

— Як потым высветлілася, у жылым пакоі аднапакаёвай кватэры загарэўся тэлевізар «Гарызонт». Кватэра належала жанчыне 1968 года нараджэння. На момант загарання ў жыллі нікога не было, — расказаў старшы інспектар цэнтра прапаганды Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч. — Мяркуецца, што прычынай здарэння стала кароткае замыканне электраправодкі тэлевізара. У выніку быў знішчаны сам тэлевізар, пашкоджана шыба, мэбля. Работнікі МНС з суседніх кватэр з выкарыстаннем масак эвакуявалі 9 чалавек, у тым ліку дваіх дзетак. Пацярпелых не было.

Сяргей РАСОЛЬКА.

■ Адукацыя

«ХІТ» ПРЫЁМНАЙ КАМПАНІІ Ў ПРАФТЭХУСТАНОВАХ — ПРАФЕСІЯ АЎТАСЛЕСАРА

У Міністэрстве адукацыі падвялі папярэднія вынікі прыёмнай кампаніі ва ўстановах прафтэхадукацыі. Нагадаем, што прыём дакументаў для ахвотных паступіць ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі быў падоўжаны да 15 верасня.

У галоўным адукацыйным ведамстве краіны не ўтойваюць, што сітуацыя з запаўненнем месцаў была сёлета даволі складаная. Усяго на дзённую форму атрымання адукацыі прынята 34,4 тысячы чалавек, або 92,9% ад кантрольных лічбаў прыёму. На аснове базавай адукацыі — 19,7 тысячы або 95,1% ад плана і на аснове агульнай сярэдняй адукацыі — 14,7 тысяч (90,1% ад плана) Самыя лепшыя паказчыкі па запаўненні месцаў — у Магілёўскай (102,3%), Гродзенскай (98,4%) і Гомельскай (96%) абласцях.

Затое на вячэрнюю форму навучання план набору быў нават перавышаны: атрымліваць прафесійна-тэхнічную адукацыю ў вячэрні час пажадалі 202 чалавекі (126,7% ад кантрольных лічбаў набору).

У чацвёртым квартале ва ўстановы прафтэхадукацыі плануецца прыняць не менш як 645 чалавек на завочную форму навучання. Зараз у асобных рэгіёнах думаюць над тым, каб у чацвёртым квартале ажыццявіць таксама і дадатковы набор на дзённую форму навучання. Гэта можа зацікавіць маладых людзей, адлічаных з ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў.

Усяго прыём сёлета ажыццяўляўся па 292 прафесіях. Асноўнай формай конкурснага адбору пры паступленні быў конкурс адзнак у дакументе аб адукацыі. Найбольш запатрабаванымі ў моладзі аказаліся наступныя прафесіі: «слесар па рамонце аўтамабіляў» (дзе конкурс даходзіў да 3 чалавек на месца); «праваднік пасажырскага вагона», «касір білетны», «памочнік машыніста цеплавоза», «цырульнік», «аператар сувязі», «машыніст горных машын», «горнарабочы ачышчальнага забою» (да 2 чалавек на месца).

У той жа час установы прафтэхадукацыі адчувалі істотныя цяжкасці пры камплектаванні груп па прафесіях лёгкай прамысловасці, машынабудаўнічага профілю, сельскагаспадарчай вытворчасці. Неахвотна ішлі маладыя людзі навучацца на прадаўцоў, цесляроў, сталяроў, станочнікаў дрэваапрацоўчых станкоў. А ў Мінску папулярнасцю не карысталіся і будаўнічыя прафесіі.

Надзея НІКАЛАЕВА

■

ЧЫГУНКА ПАШЫРАЕ «ЭЛЕКТРОННЫЯ» КІРУНКІ

З 26 верасня Беларуская чыгунка адкрывае продаж праязных дакументаў з электроннай рэгістрацыяй на ЦЯГНІКІ па новых кірунках.

Як паведамілі ў прэс-службе магістралі, з названай даты выкарыстанне паслугі электроннай рэгістрацыі ў рэжыме доследнай эксплуатацыі будзе пашырана для праезду ў цягніках №095/096 (097/098) Гомель — Мінск, №138/137 Гродна — Мінск, №143/144 Магілёў — Мінск, №108/107 Мінск — Гомель — Калінкавічы. У выніку пасажыры змогуць набыць праязныя дакументы з электроннай рэгістрацыяй на цягнікі, што курсіруюць паміж Мінскам і ўсімі абласнымі цэнтрамі. Нагадаем, што праезд пасажыраў па электронных праязных дакументах з электроннай рэгістрацыяй каля двух тыдняў вядзецца ў цягніках №106/105 Брэст — Мінск і №117/118 Віцебск — Мінск.

Колькасць цягнікоў, пры праездзе ў якіх будзе дзейнічаць новая паслуга, будзе ўвесь час павялічвацца, дадаюць у прэс-службе Беларускай чыгункі. З 1 кастрычніка плануецца адкрыць продаж электронных праязных білетаў з электроннай рэгістрацыяй на цягніках №112/111 Брэст — Мінск, №109/110 Магілёў — Брэст, №142/141 Брэст — Віцебск, №805/806 Гомель — Мінск.

Варта нагадаць, што аплата праезду праз інтэрнэт з электроннай рэгістрацыяй дазваляе значна эканоміць час, не афармляючы праязны дакумент у білетнай касе. Электронная рэгістрацыя выконваецца не пазней, чым за адну гадзіну да адпраўлення цягніка з пачатковай станцыі маршруту яго руху. Пасадка пасажыраў вядзецца пры прад'яўленні дакумента, які сведчыць асобу, на падставе якога быў аформлены электронны праязны дакумент.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Папаўненне ў дзяржбяспецы

У мемарыяльным комплексе «Дзяржынава» Стаўбцоўскага раёна адбыўся ўрачысты рытуал пасвячэння ў супрацоўнікі органаў дзяржаўнай бяспекі Беларусі выпускнікоў Інстытута нацыянальнай бяспекі, Ваеннай акадэміі, установ вышэйшай адукацыі Беларусі і Акадэміі ФСБ Расіі.

Як паведамляюць у цэнтры інфармацыі і грамадскіх сувязяў КДБ, выпускнікі атрымалі пасведчанні супрацоўнікаў органаў дзяржбяспекі, віншаванні старшыні КДБ Рэспублікі Беларусь, генерал-лейтэнанта Вадзіма Зайцава, дзяржсакратара Савета Бяспекі Рэспублікі Беларусь, генерал-палкоўніка Леаніда Мальцава, прадстаўнікоў Беларускай грамадскай арганізацыі ветэранаў КДБ «Гонар».

Святлана БАРЫСЕНКА.

«Пазік» гарэў адкрытым полымем...

У Асіповіцкім раёне ў вёсцы Літвінава ў дарозе загарэўся аўтобус. «ПАЗ» належаў сельскагаспадарчаму вытворчаму кааператыву «Калгас «Авангард». Мяркуецца, што прычынай пажару стала кароткае замыканне электраправодкі аўтобуса. Калі на месца выкліку прыбылі падраздзяленні пажарных, транспарт гарэў адкрытым полымем. Сямёра пасажыраў і кіроўца самастойна пакінулі аўтобус, ніхто з іх не пацярпеў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШАШКІ

Пад рэдакцыяй міжнароднага арбітра Мікалая ГРУШЭЎСКАГА

ЗА ДОШКАЙ — МАЙСТАР

Ім з'яўляецца Іван Наўроцкі. У 1997 годзе ён стаў чэмпіёнам Беларусі па складанні канцовак на 64-клетачнай дошцы. У першынстве краіны 2002 года паўтарыў поспех у раздзеле 100-клетачных камбінацыйных праблем. Шмат разоў быў сярэбраным прызёрам.

Таму Міністэрства спорту і турызму прысвоіла яму ганаровае званне нацыянальнага майстра па шашачнай кампазіцыі. Па ёй мінчанін не прапускае амаль ніводнага спаборніцтва. Так, у папулярным конкурсе «Жамчужына Палесся-2012» заняў высокае чацвёртае месца. Пазнаёмцеся з яго новай працай, дасланай нам у рэдакцыю:



Белыя: b4, c5, d4, e5, f4, f6, h2, h6 (8). **Чорныя**: a3, c7, d2, f2, f8, g3, h4 (7). Атака белых на сваю карысць праходзіць і тады, калі простую чорных f2 паставіць на поле b2.

ШАСНАЦЦАТЫ

Гэты конкурс працягваецца чарговымі заданнямі Л. С. Вітошкіна:



№ 16/10. **Белыя**: 26, 27, 31, 34, 38, 40, 44, 47 (8). **Чорныя**: 8, 9, 10, 17, 18, 23, 29, 35, 45 (9). Выйгрыш.

№ 16/11. **Белыя**: 9, 13, 24, 33, 37, 41, 42, 43, 47 (9). **Чорныя**: 15, 18, 22, 26, 28, 32, 44 (7). Перамога белых.

● ● ●

Тэрмін для адказаў традыцыйны — два тыдні. Накіроўвайце іх на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Шашкі».***

РАШЭННІ

Аўтарскі-16 (Л. Вітошкін): № 8 — 12, 28, 3 (41AB) 20 (10) 4 (46) 27, 37, 47x. A(27) 20 (41) 37, 42x. B(19) 26 (41) 42-37, 42 (24C) 20 (37) 47x. C(23) 20 (37D) 14x. D(28) 42x і № 9 — 18, 39, 12, 3, 15 (37A) 10x. A(23) 20 (28) 42x.

«Пагода ў доме-9» і па-за конкурсам (М. Грушэўскі): № 2 — 1. de5 dc5 2. ef6 3. de3 4. h:b4 5. c:e3x, № 3 — 1. hg5 2. h:c1 3. c:g5 4. g:g5x і № 4 — 2. h:b8 hg1 3. ba7 4. ab4 5. b:f2/g1 ab2 6. dc3x.

Заданні аўтарскіх конкурсаў-15 (П. Шклудава) і 16 (Л. Вітошкіна), пазаконкурсныя пазіцыі В. Шошына, М. Цветава, А. Сапегіна, В. Варушылы, а таксама эпізоды з партый А. Пярхальскі — М. Лічко і А. Пярхальскі — У. Бандарык зацікавілі чытачоў. З імі справіліся Аляксандра Камінская (Вілейка), У. Валчкоў (Маладзечна), В. Талкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага раёна), І. Ананіч (Гродна), А. Шурпін (Клімавічы), С. Нячаеў (Баранавічы), А. Літвінаў (Мінск), А. Белы (Наваполацк) і інш. Сярод іх Уладзімір Сапяжынскі (Рагачоў) заўважыў, што ў сітуацыі А. Пярхальскі — У. Бандарык да нічыёй вядзе 1. cb4= і 1. g7=.

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ

по продаже имущества, принадлежащего

ООО «Весткапстрой»

Лот № 1. Линия «Мобипроф» по производству металлического профиля для систем гипсокартона, в том числе в составе линии профилегибочный станок Мобипроф ГК, заводской номер 37, для производства профиля потолочного ПП 60х27 и профиля потолочного направляющего ППН 28х27; станок для продольно-поперечной резки металла Мобипроф СПР-1250/5-А, заводской номер 283; разматыватель рулона неприводной РМ-1250, стоимостью 156 119 800 рублей, расположенная по адресу: г. Минск, ул. Лукьяновича, 10.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества.

Данное имущество является предметом залога.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/,
а также в помещении хозяйственного суда г. Минска:
г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 19.10.2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Минец И.Н., тел./факс: 294-93-66; ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел. 294-93-67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость	**Столы бильярдные в ассортименте и сопутствующие товары.** Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/ sales/.
Собственник (владелец) имущества	ЧУП «Кастигар», УНП 390528038
Местонахождение (адрес) имущества	г. Новополоцк, ул. Парковая, 1
Наличие обременений	отсутствуют
Место (адрес), дата и время проведения торгов	**С 9.00 19 октября 2012 года по 18.00 28 октября 2012 года.** На интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь http://court.by/sales/
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http://court.by/vitebsk/ Судебный исполнитель Ткаченко Сергей Владимирович, тел./факс: (80212) 49 13 49, (8 029) 663 53 24, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел.: (80212) 49 13 40, (8044) 746 73 00
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, в течение 15 дней со дня, следующего за днем размещения публичного извещения об электронных торгах на интернет-портале хозяйственных судов Республики Беларусь, обязано пройти регистрацию. Для регистрации на сайте лицо знакомится с порядком проведения торгов, дает подписку об отсутствии препятствий для участия в торгах в соответствии со статьей 384 ХПК, перечисляет задаток в размере 10 % от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 не позднее 12.10.2012 и заполняет заявление. Более подробную информацию можно получить на сайте ВХС http://court.by/vitebsk/divestiture/, http://court.by/ sales/.

«ГАЛУБКА» НАЗВАНА ЛЕПШАЙ. З «СІМПАТЫЯЙ»

Лепшымі беларускімі таварамі на рынку Расійскай Федэрацыі прызнана прадукцыя 9 прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам». Гэта стала вядома па выніках аднайменнага штогадовага конкурсу, які праводзіць Дзяржаўны камітэт па стандартызацыі Рэспублікі Беларусь.

Сёлета яго лаўрэатамі ў намінацыі «Прамысловыя тавары для насельніцтва» і стала прадукцыя 8 прадпрыемстваў канцэрна (тканіна «Гарант» для спецадзення вытворчасці ААТ «Магатэкс» стала лепшай у намінацыі «Прадукцыя вытворчатэхнічнага прызначэння»). Звання лепшых тавараў удастоены, напрыклад, калекцыя трыкатажных вырабаў для дзяўчынак вытворчасці ААТ «Світанак» з Жодзіна, трыкатажная калекцыя жаночых піжам і начных кашуль «Сімпатыя» ААТ «Купалінка», курткі для дзяцей ад «Світанка» з Оршы. Лепшымі таксама названы пасцельная бялізна з бавоўны для дзяцей і дарослых вытворчасці Баранавіцкага вытворчага баваўнянага аб'яднання, мужчынскія чаравікі з верхам з натуральнай скуры клеявога метаду мацавання ад «Белвеста», сталовы сервіз «Галубка» з 36 прадметаў вытворчасці ЗАТ «Добрушскі фарфоравы завод» і іншыя.

Нагадаем, што мэта конкурсу — стымуляванне вытворчасці высакаякаснай канкурэнтаздольнай айчыннай прадукцыі, стварэнне высокай рэпутацыі айчынных таваравытворцаў на расійскім рынку. Да разгляду на конкурс прымаюцца тавары пры ўмове іх пастаўкі ў Расійскую Федэрацыю цягам не менш аднаго года.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

Зноў пра дзяржаўную мову

Пасля таго, як у Беларусі з'явіліся дарожныя знакі, якія дублююць назвы населеных пунктаў на лацінскай мове, у Інтэрнэце пачалася дыскусія наконт таго, ці варта ўвогуле ўводзіць такія знакі. Прыхільнікі ідэі лічаць, што гэта дапаможа замежным турыстам арыентавацца на мясцовасці, а таксама будзе спрыяць развіццю беларускай мовы. Праціўнікі ж лічаць, што ў Беларусі ёсць толькі адна дзяржаўная мова — беларуская, і ніякіх іншых не трэба.

Мы вырашылі даведацца, ці ёсць у нашых чытачоў свой погляд на гэтую праблему. Напішыце нам, калі ласка, на адрас: ***220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а, рэдакцыя газеты «Звязда», рубрыка «Зноў пра дзяржаўную мову».***

г. ВИТЕБСК **05.11.2012**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПОВТОРНОМ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ НАЧАЛЬНАЯ ЦЕНА ПРОДАЖИ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ СНИЖЕНА НА 20 ПРОЦЕНТОВ

№ лота	Наименование предмета аукциона	Характеристика предмета аукциона	Начальная цена предмета аукциона, рублей	Сумма задатка, рублей
1	Неиспользуемое почтовое отделение связи, расположенное по адресу: Витебская область, Витебский район, Новкинский с/с, д. Комары, ул. Придорожная, д. 3	Характеристика объектов недвижимости: капитальное строение с инвентарным номером 200/С-47250 (здание специализированное связи) одноэтажное бревенчатое облицованное кирпичом, фундамент – бетонный ленточный, перекрытия – дощатые, крыша шиферная, общей площадью 33,5 кв.м, 1957 года постройки с холодной пристройкой, сараем, уборной. Земельный участок: с кадастровым номером 221287008601000023, площадью 0,0284 га, для обслуживания отделения почтовой связи, сроком аренды 50 лет.	18514051	3702800
2	Неиспользуемые здания, сооружения, расположенные по адресу: Витебская область, г. Полоцк, пер. Тросницкий 5-й, 47, и право заключения договора аренды земельного участка	Характеристика объектов недвижимости: **капитальное строение с инв. № 250/С-11327** (здание административно-хозяйственное) с двумя основными пристройками, диспетчерской, крыльцом бетонным, одно-двухэтажное кирпичное, 1975 г. постройки, фундамент бетонный, крыша шиферная, перекрытия деревянные, общая площадь 302,3 кв.м; **капитальное строение с инв. № 250/С-11328** (здание специализированное транспорта – ремонтная мастерская) с тремя пристройками, одно-двухэтажное кирпичное, 1978 г. постройки, фундамент бетонный, крыша рулонная, перекрытия – железобетонные плиты, общая площадь 871,2 кв.м; **капитальное строение с инв. № 250/С-11329** (здание специализированное автомобильного транспорта – гараж-мастерская) с пристройкой, материальным складом, котельной, дымовой трубой, ограждением (бетонные плиты, металлическая сетка), воротами, мощением (асфальтовое, бетонное), осветительной вышкой одноэтажное кирпичное, 1975 г. постройки, фундамент – бетонные блоки, крыша – рулонная, совмещенная, перекрытия – железобетонные плиты, общая площадь 695,8 кв.м; **капитальное строение с инв. № 250/С-11330** (здание специализированное транспорта – навес на 24 сельскохозяйственные машины) со стоянкой для машин, одноэтажное кирпичное, 1975 года постройки, фундамент бетонный, крыша – рулонная, перекрытия – железобетонные плиты, общая площадь 1428,5 кв.м; **капитальное строение с инв. № 250/С-30037** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – водопроводные сети) с трубопроводом напорным, 4 колодцами водопроводными, протяженностью 417 м; **капитальное строение с инв. № 250/С-30038** (сооружение специализированное водохозяйственного назначения – канализационная сеть) с трубопроводом безнапорным, 3 колодцами канализационными, протяженностью 116 м. Земельный участок: с кадастровым номером 243500000005000038, площадь 3,5203 га для содержания и обслуживания производственной базы, сроком аренды 25 лет. Ограничение (обременение) прав: охранная зона магистрального трубопровода, площадью 0,1518 га, охранная линия ЛЭП, напряжением свыше 1000 В, площадью 0,0644 га.	1834027073	366805400

ОРГАНИЗАТОР – фонд «Витебскоблимущество», г. Витебск, ул. «Правды», 38, контактный телефон в г. Витебск: (0212) 476096, 488704, сайты www.gki.gov.by, www.fondgosim.vitebsk.by, e-mail: votfondgi@tut.by.

Аукцион состоится 5 ноября 2012 года в 15 часов в здании фонда «Витебскоблимущество» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38.

1. Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00, последний день приема документов 02.11.2012 до 17.00** по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 38, кабинет 308. Заключительная регистрация участников 05.11.2012 с 14.00 до 15.00. К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Сумма задатка перечисляется до подачи заявления на участие в аукционе на расчетный счет № 3642903027026 в Региональной дирекции № 200 ОАО «БПС-Сбербанк» БИК 153001369. Получатель – фонд «Витебскоблимущество», УНП 300002495.

2. Участник, ставший победителем аукциона (претендентом на покупку), после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; не позднее 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола аукциона возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, формированием земельных участков и государственной регистрации в отношении этих земельных участков; не позднее 12 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона заключить договор купли-продажи недвижимости и договор аренды земельных участков.

3. Подробная информация об условиях участия в аукционе и условиях продажи предметов аукциона опубликована ранее в газете «Звязда»: по лоту № 1 – от 17.07.2012 № 135 (27251); по лоту № 2 – от 24.08.2011 № 160 (27024), от 05.10.2011 № 190 (27053), от 15.11.2011 № 217 (27081).

4. В соответствии с частью третьей пункта 7 Декрета Президента Республики Беларусь от 7 мая 2012 г. № 6 земельный участок по лоту № 1 предоставляется в аренду покупателю имущества без проведения аукциона и без взимания платы за право заключения договора аренды.

■ Карані

ПОШУКІ ПРОДКАЎ

«Генеалогія робіць чалавека чалавекам. Калі ты пачынаеш распрацоўваць старыя дакументы, думаць пра людзей, што жылі раней, іх жыцці, іх трагедыі, ты перастаеш быць эгаістам...» Карэспандэнт «Звязды» на свае вочы бачыў, як у людзей аднаўлялася кроўная роднасць.

Бонч-Асмалоўскіх сустракаюць у Блоні.

СЯДЗІБА АЖЫЛА

Напэўна, даўно не было так цёпла, утульна і гаманліва ў старой сядзібе XIX стагоддзя ў вёсцы Блонь, якая належала некалі роду Бонч-Асмалоўскіх. Будынак позняга класіцызму літаральна ажыў на некалькі гадзін. Паглядзець на дом сваіх продкаў сюды прыехалі шматлікія нашчадкі, што сабраліся з усяго зямнога шара: з Беларусі, Расіі, Швейцарыі, Злучаных Штатаў...

Сёлета роду (і аднайменнай вёсцы Асмолавічы) споўнілася 500 гадоў. І гэта толькі па афіцыйных звестках (першая згадка адносіцца да 1512 года), а насамрэч гісторыя сям'і можа быць яшчэ глыбейшай. За столькі гадоў былых насельнікаў Вялікага Княства Літоўскага лёс раскідаў па свеце. Але вельмі доўга Бонч-Асмалоўскія жылі менавіта ў Беларусі. Былі грамадскімі і палітычнымі дзеячамі, выдатнымі воінамі і проста добрымі людзьмі. Служылі дзяржаве, былі сябрамі народу. Ад людзей і ад радзімы ніколі не адварочваліся. Апошнія

Мясцовы кот пазнаў сваіх.

ўладары сядзібы ў Блоні, Анатоль Восіпавіч Бонч-Асмалоўскі з жонкай Варварай Іванаўнай Вахоўскай і дзецьмі Глебам, Ірынай, Іванам і Радзівонам, былі народнікамі і за тое сядзелі, напэўна, больш, чым жылі ў той сядзібе. Усе прыбыткі ад маёнтка ў іх ішлі на рэвалюцыйную дзейнасць. А землі тут добрыя, таму і прыбыткі нядрэнныя былі. Дарэчы, жыў тут некалі і быў знаёмы з рэвалюцыянерамі Якуб Колас, калі працаваў настаўнікам. Унучка Глеба, вядомага антраполага, расійская пісьменніца Марына Бонч-Асмалоўская цяпер сабрала ў гэтым маёнтку частку тых сваіх родзічаў, якіх знайшла за два гады працы над кнігай аб сваім родзе. Як ні дзіўна, але пазгаджаліся прыехаць на сустрэчу людзі нават з Каліфорніі (ЗША). Усіх іх цягнула сюды. Амаль усе нашчадкі першы раз апынуліся ў Беларусі — і зрабілі гэта з вялікай радасцю, ведаючы, што адсюль ідуць іх карані. Старыя, маладыя, малыя — усе ў аднолькавым захапленні, з бліскучымі вачыма слухалі расповед пра сваіх продкаў, праходзілі па пакоях, дзе некалі тыя жылі. Думаю, што ніхто з гасцей не зможа апісаць дакладна свой стан у той момант. Па тварах я разумею, што ўнутры ў іх зараз пачуццё, падобнае на тое, якое ўзнікае пры першым каханні — нічога не зразумела, проста добра і ўсё. Некаторыя жанчыны расчуліся да слёз. Але ўсё роўна пасля ўсе падыхо-

дзілі да генеалагічнага дрэва сваёй сям'і і весела тыцкалі пальцам у свае імёны на паперы, фатаграфаваліся.

А ВЫ МНЕ ХТО?

Ад шумнай гаворкі я збег на двор. Агледзеў спакойна сядзібу. Вецер асвяжыў думкі. Сустрэўшы ўсіх ізноў (яны ўжо таксама выйшлі на двор), я адчуў сябе настолькі ўтульна, што здалося, быццам гэта ўсе мае сваякі, гэта мая вялікая сям'я, якая сабралася з нагоды, як гэта часцей за ўсё бывае, чыйго-небудзь вяселля. У наступнае імгненне я вярнуўся ў рэальнасць, але Бонч-Асмалоўскія засталіся ў «мроі». Літаральна за гэтыя паўтары-дзве гадзіны, што спатрэбіліся на агляд дома, яны перасталі быць звычайным натоўпам незнаёмых паміж сабою людзей. Гэта ўжо былі сваякі. Хоць і вельмі далёкія. Гэта можна было зразумець і заплюшчыўшы вочы, бо адусюль было чутно: «Прабачце, а вы мне кім даводзіцеся?». Хлопцы і дзяўчаты, жанчыны і мужчыны пачалі без аніякіх прымусаў знаёміцца і вылічваць «шчыльнасць» свайго сваяцтва. «Ніколі не думаў, што ў мяне столькі родзічаў, — прызнаецца Барыс Груздзеў, які прыехаў сюды з маці, братам, сястрой і дзядзькам з яго сям'ёй з Санкт-Пецярбурга. — А вы мне таксама сваяк?» — на ўсялякі выпадак, з усмешкай пытае мяне хлопец. Я прызнаюся, што насамрэч толькі карэспандэнт, і пачынаю распытваць аб уражаннях. Толькі потым разумею, што няма чаго марна малоць языком: на каленях у суразмоўцы, які прысеў на прызбу, лашчыцца мясцовы кот. Зразумела, што пазнаў сваіх... Вось табе і ўражанні.

ДАВАЙЦЕ ЛЕПШ УСЕ РАЗАМ СЯДЗЕМ!

З цяжкасцю вызваліўшыся ад пяшчотнага і вернага ката, мы пакінулі сэрца Беларусі (у Мар'інай Горцы, побач з якой знаходзіцца Блонь, — геаграфічны цэнтр нашай краіны) і выправіліся ў Асмолавічы, каб убачыць мясціны, адкуль род Асмалоўскіх пачынаўся. Але гэта толькі заўтра. Сёння нас чакала незвычайная вячэра ў Клімавічах, дзе мы начавалі.

Уладкаваўшыся ў гасцініцы, усе сталі патроху рухацца ў бок мясцовага рэстарана — збіраліся на вячэру. Інтэр'ер шараговага правінцыйнага рэстаранчыка наводзіў сум, падкрэсліваў будзённасць і не даваў надзеі ні на што, акрамя акту прыняцця ежы. Але пачуццё кроўнага яднання хутка перамагло ва ўсіх, асабліва ў моладзі. «Давайце лепш сядзем усе разам, за адзін вялікі стол», — ці то прагучала невядома ад каго, ці проста адначасова ўвасобілася ў думках кожнага. Праз хвіліну ўсе сталы сфарміравалі доўгі «сямейны стол». Нечакана і ўрачыстасць з'явілася сярод шэрасці і звычайнасці. Не хапала толькі мяккіх, ціхіх гукаў прыдворнай музыкі — і ўсё было б, як у кіно. На жаль, калонкі тольмалой прыязджала, а мяне ні разу не было. Прадзед памёр у 1980-м, дом стаў дзяржаўным. А я толькі праз 10 гадоў нарадзіўся. І ўсё роўна туды мяне цягне, там наталяюцца нейкія незвычайныя, малазразумелыя, але вельмі важныя патрэбы. Продкі сілы даюць.

Далей можна было не размаўляць: мы з Марынай Андрэеўнай добра адзін аднаго зразумелі па вачах і былі згодныя адзін з адным. Ёй такія пачуцці яшчэ больш знаёмыя. Мы сышліся на тым, што ведаць радавод трэба абавязкова.

«ПРОДКІ МЯНЕ САМІ ШУКАЮЦЬ...»

«Так атрымалася, што некалькі гадоў таму я пачала займацца сваёй генеалогіяй, — расказвае Марына Бонч-Асмалоўская. — Убачыла шмат трагічных лёсаў, неаплаканых людзей. Стала заказваць па іх паніхіды. Па тых, хто быў расстраляны ў 1918-1919 гадах, хто загінуў у Першую сусветную вайну. Аб гэтым згубленым пакаленні мне захацелася шукаць звесткі. Мне захацелася стаць нейкім звязкам паміж гэтымі людзьмі і нашым жыццём, каб захавалася памяць. Генеалогія нешта робіць такое з чалавекам, нешта адкрывае ў ім... Я б не паверыла ў гэта яшчэ некалькі гадоў таму, калі займалася толькі сваімі справамі, сваім жыццём. Адным словам, калі гэта выйшла на ўзровень сардэчнасці, то тады ўсё і адкрылася. У мяне адчуванне, што продкі самі мяне шукаюць, бо мне бесперарыўна праз інтэрнэт дасылаюць нейкія звесткі. Ёсць выдатны генеалагічны форум ВГД. І там людзі ўвесь час адзін аднаму дапамагаюць. Продкі сталі напамінаць аб сабе — так і пачалася праца над кнігай. Гісторыя сям'і, якая тут жыве (хм... Для мяне яны жывыя!)... якая жыла тут, вельмі цікавая і трагічная. Анатоль (Бонч-Асмалоўскі. — **Аўт.**) і Варвара (Вахоўская. — **Аўт.**) — народнікі. І выдаткоўвалі ўсе свае сродкі на рэвалюцыю. Яны да канца былі рэвалюцыянерамі. Пастаянна хтосьці з іх сядзеў. Бывала, што і ўся сям'я сядзела. Унучка старэйшага сына Івана падаравала мне запісы майго дзеда Глеба. А ён займаўся генеалогіяй нашага роду. Я іх заўсёды вазіла з сабою. Але ў нейкі момант яны мне нечакана спатрэбіліся. Я на іх паглядзела, прачытала — і раптам мне стала вельмі цікава. Цяпер я адчуваю род і продкаў. І для мяне зусім не мае значэння нават нацыянальнасць: я з Расіі, але мае продкі жылі тут».

Асвячэнне памятнага крыжа.

мы б не ведалі сваёй гісторыі наогул, — пачынаю «філасофскія» развагі я. — На маю думку, ведаць свой род трэба кожнаму, незалежна ад таго, хто былі твае продкі. У многіх жа радавод будзе спрэс сялянскі. Але і гэта не менш годна за шляхецкі ці царскі. Такія веды будуць гарантаваць патрыятызм, яднаць з радзімай мацней за клятвы, прысягі і гэтак далей. Я, напрыклад, кожны год стараюся з'ездзіць на сваю «гістарычную радзіму» — месца, дзе жыла толькі мая бабуля з сёстрамі ды маці ўлетку кі «выплёўвалі» папсовае «тыц-тыц». Нічога — перашкодзіць сапраўднай высакароднасці нішто не можа. І пачалася сямейная вячэра. Для спрашчэння стасункаў кожны па чарзе ўставаў і прадстаўляў сябе астатнім. Пайшла вясёлая гамонка — як быццам яны ўсе тут ведаюць адзін аднаго з нараджэння.

ВЕДАЦЬ УЛАСНЫ РАДАВОД? АБАВЯЗКОВА

Мне пашчасціла сядзець побач з Марынай Бонч-Асмалоўскай. Кірунак нашай размовы паступова «збочыў» з гісторыі канкрэтнай сям'і да абмеркавання неабходнасці ведання сваіх каранёў.

— Ведаеце, зараз даволі папулярным становіцца «генеалагічны рух». Многія хочуць ведаць свой радавод — у архівах усё часцей чэргі... — кажа Марына Андрэеўна.

— Але ў той жа час каго ні спытай, хаця б аб прабабцы — добра калі імя ведаюць, — пачынаю спрачацца я.

— Сапраўды. Масавага характару гэта пакуль не набыло. Хтосьці кажа, што яму тое нецікава. Хтосьці — што не мае часу на «раскопкі» ў архівах. Шмат ёсць і такіх, якія сцвярджаюць, што не хацелі б ведаць гісторыю сям'і, бо сярод продкаў былі альбо злачынцы, альбо яшчэ якія родзічы з цемнаватым лёсам. У выніку варушыць гэта ўсё — непрыемна...

— Калі б нашы продкі так думалі, то

АМЕРЫКАНЕЦ ЗНАЙШОЎ БЛІЗКІХ СВАЯКОЎ У БЕЛАРУСІ

Наступнай раніцай дэлегацыя нашчадкаў выправілася ў Асмолавічы, вёску ў Клімавіцкім раёне, у якой жылі самыя першыя прадстаўнікі будучых Бонч-Асмалоўскіх. Там было вялікае свята з нагоды 500-годдзя (пра яго наша газета ўжо распавядала ў нумары за 11 верасня 2012 года). Для аднаго з гасцей свята скончылася знаходкай траюрадных сясцёр. Пітэр з Каліфорніі, пакуль ішло святкаванне, стаў распытваць мясцовых жыхароў пра сваіх магчымых родзічаў. Ён ведаў, што яны павінны дзесьці тут быць. Аказалася, што ў суседняй вёсцы сапраўды жывуць яго траюрадныя сёстры. Хтосьці згадзіўся хуценька звазіць Пітэра туды на машыне. І без таго ўсмешлівы амерыканец вярнуўся адтуль яшчэ больш вясёлым і шчаслівым і сказаў, што абавязкова сюды яшчэ прыедзе.

ХОЦЬ КАПЛІЧКУ, АЛЕ ПАБУДУЕМ!

Яшчэ адна яркая падзея адбылася ў тыя дні ў Асмолавічах. Мясцовыя жыхары

Так сустрэліся тыя, хто два гады ведалі адзін аднаго толькі па інтэрнэце.

і замежныя госці разам прысутнічалі на асвячэнні памятнага крыжа на месцы, дзе стаяла некалі царква. Тут усіх нашчадкаў ізноў апанаваў покліч продкаў. «Давайце збярэм грошы на пабудову тут капліцы, — у адзін голас заявілі яны. — Вядома, на царкву грошай не хопіць, але каплічку мы пацягнем». Так і вырашылі, што абавязкова знойдуць грошы і перададуць іх мясцоваму святару. А той таксама ўспрыняў гэту прапанову вельмі прыязна. «Так мы хоць неяк ушануем памяць сваіх продкаў», — далей гучалі галасы...

НА ЗАМКАВАЙ ГАРЫ

Бонч-Асмалоўскія не забыліся наведаць і Крычаў. Менавіта ў Крычаўскім замку нёс сваю службу некалі Павел Аўсеевіч Асмалоўскі (першы афіцыйны прадстаўнік гэтай сям'і). Ды і многія далейшыя носьбіты прозвішча абаранялі крычаўскую зямлю, якая знаходзілася на памежжы Вялікага Княства Літоўскага і Маскоўскага княства. На замкавай гары, дзе некалі быў замак (на жаль, драўляны, таму і не захаваўся да нашых дзён), цяпер стаіць невялічкая царква і некалькі яблынь з вельмі смачнымі пладамі. Там увесь час гуляе шалёны вецер, а з вышыні так прыемна назіраць за Сожам, на якім стаіць Крычаў. Тыя, хто ляжыць у гэтай зямлі і чыя кроў тут лілася стагоддзямі, «сустрэлі» гасцей ветліва. Калі госці забраліся на тое месца, дзе раней стаяла адна з чатырох вежаў, здані спачатку ціхенька, а пасля больш моцна (як даўнія сябры) патузалі, пацерабілі валасы нашчадкаў. Думаю, здані хацелі сказаць «дзякуй» за тое, што на іх не забыліся...

Не забывайцеся ж і вы на сваіх продкаў. Старайцеся ведаць хаця б некалькі пакаленняў. Прывучайце да гэтага дзяцей — тады яны і вас паважаць будуць. Ды чалавеку і жыць заўсёды лепш, калі ён ведае, што ў яго ёсць карані, на якія можна абаперціся.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

Мінск — Блонь — Асмолавічы — Крычаў

Нас чакае спатканне з Бібліяй Францыска Скарыны

Сёння ў Мінску пачынаюцца чарговыя, ужо дзявятыя па ліку, восеньскія Тыдні Германіі ў нашай краіне. З гэтай нагоды адбылася прэс-канферэнцыя прадстаўнікоў пасольства ФРГ у Беларусі.

Бадай, самае цікавае мерапрыемства Тыдняў, на мой погляд, звязана з урачыстым адкрыццём 4 кастрычніка ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі экспазіцыі Біблії Францыска Скарыны, якую прывезлі да нас з нямецкага горад Гёрліца. Цікавая гісторыя гэтага выдання. Кажуць, што яно з'явілася ў Празе ў 1517-1519 гадах. Потым нейкім чынам трапіла ў Гёрліц і там на працягу некалькіх стагоддзяў лічылася яго ўласнасцю, захоўвалася ў багатых фондах рэдкіх кніг і выданняў навуковай бібліятэкі. І толькі ў 2003 годзе ў гэтых фондах Біблія была нібы зноў знойдзена. Яе адкрыццё выклікала вялікую цікавасць у даследчыкаў. Экспазіцыя Біблії ў Беларусі пройдзе ў два этапы. Першы, як ужо гаварылася, у Мінску. Другі — у нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Нясвіж».

Увогуле Тыдні Германіі — гэта выдатная магчымасць пазнаёміцца з сучаснай нямецкай культурай, яе традыцыямі і здабыткамі. Мінчан і гасцей сталіцы чакае разнастайная праграма: тэматычныя выставы і семінары, краязнаўчая віктарына «Германія», дэманстрацыя кінастужак вядомых нямецкіх майстроў, канцэрты. Цікавай культурнай падзеяй абяцае стаць канцэрт пяці салістаў сусветна вядомага Берлінскага філарманічнага аркестра ў Белдзяржфілармоніі. Іх выступленне будзе прысвечана Дню германскага адзінства. Гэта нацыянальнае свята народ ФРГ адзначае 3 кастрычніка.

Нагадаем, традыцыя правядзення Тыдняў Германіі ў Беларусі была закладзена ў 2004 годзе. За мінулы час Тыдні, якія праводзяцца пасольствам ФРГ сумесна з нямецкімі і беларускімі партнёрамі, сталі важнай часткай работы па збліжэнні двух народаў на культурнай глебе. Звычайна кожныя Тыдні маюць сваю спецыяльную галоўную тэму. Летась, напрыклад, гэта было 200-годдзе з дня смерці вядомага нямецкага драматурга, празаіка, паэта і публіцыста Генрыха фон Клейста. Сёлета Тыдні адкрываюцца «Святам нямецкай мовы». Гэта будзе шэраг розных цікавых мерапрыемстваў. У прыватнасці, з дакладам «Вывучэнне замежных моў: мужчынская альбо жаночая справа?» выступіць доктар Барбара Шменк. Сваё майстэрства прадэманструе музычнае кабарэ «Дзіўныя ноты» з новай праграмай «Ноты, якія пасварыліся».

Шэраг мерапрыемстваў Тыдняў прысвечаны студэнцкай моладзі. Напрыклад, Інстытут нямецкіх даследаванняў мяркуе наладзіць семінары на тэму «Сродкі масавай інфармацыі ў Германіі». Іх арганізатары абяцаюць даследчую вандроўку па ландшафце нямецкіх друкаваных СМІ, радыё і тэлебачання. У рамках Тыдняў сумесна з Нацыянальнай акадэміяй навук пройдзе Дзень маладога вучонага. У ім прымуць удзел маладыя беларускія і нямецкія навукоўцы.

Леанід ЛАХМАНЕНКА.

АРТЫЛЕРЫЯ. ДЫ НЕ ЎСЯ

Прыжыццёвае выданне першай часткі кнігі навукоўца родам з Прыдзвіння Казіміра Семяновіча «Вялікае мастацтва артылерыі» цяпер маюць і беларусы

Надзвычайна багатая на помнікі кніжнай культуры Беларусь мае толькі каля 10% усёй сваёй кніжнай культурнай спадчыны, запэўнівае дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман Матульскі. На жаль, наша кніжная артылерыя сёння выступае не ў поўным складзе. Але «БПС-Сбербанк» у Год кнігі вырашыў дапамагчы трошкі выправіць гэтую невясёлую сітуацыю. Набыўшы ў адной з антыкварных букіністычных кнігарняў Германіі два прыжыццёвыя выданні першай часткі «Вялікага мастацтва артылерыі» Казіміра Семяновіча на латыні, выдадзеную ў Амстэрдаме ў 1650 годзе, і па-французску, выдадзеную там жа ў 1651 годзе. Дзве вялікія кнігі (кардон, скура), упрыгожаныя гравюрамі Якава Ван Меерса па эскізах самога Семяновіча, даволі добра захаваліся, калі ўлічыць, што ім больш за 360 гадоў.

— Казіміра Семяновіча можна назваць адным з тых беларусаў, якія змянілі свет. Таму што яго твор — кніга, якая не страціла свайго значэння і зараз. Сёння мы ўспрымаем яе, вядома, як помнік навукова-тэхнічнай думкі, але яна паслужыла асновай для вельмі многіх вынаходніцтваў у галіне ракетабудавання, — лічыць Таццяна РОШЧЫНА, эксперт па кніжных помніках Беларусі, бібліёграф навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства НББ. — Да апошняга часу імя Семяновіча было вядома вельмі вузкаму колу спецыялістаў. Хоць і пры жыцці, і сёння Семяновіч быў і застаецца для ракетчыкаў і феерверкераў усяго свету сапраўды адным з самых аўтарытэтных вынаходнікаў. Казімір Семяновіч дакладна прадказаў лёс сваіх адкрыццяў. Ён пісаў, што яго творы праз шмат гадоў будуць забытыя, а яго вынаходніцтвы прысвояць больш познія аўтары.

Дык што з такога ашаламляльна наватарскага напісаў у сваёй кнізе вучоны ліцвін?

Кніга Семяновіча для многіх стала адкрыццём у галіне артылерыі і піратэхнікі. У сваім творы наш земляк, акрамя ўсяго іншага, апісаў уладкаванне шматступенчатай ракеты за 250 гадоў да Цыялкоўскага. Што ў далейшым вызначыла шляхі развіцця артылерыі ў Еўропе. Твор беларуса лёг у аснову будучага касмічнага ракетабудавання. Семяновічу належыць яшчэ і першынство ў распрацоўцы так званай «разумнай зброі». У асобным раздзеле кнігі апісана ўніверсальная оптыка-механічная сістэма прыцэльвання і навядзення для зброі і ракет. У сістэме былі элементы памяці і аўтаматызацыі, што гучала зусім рэвалюцыйна па тых часах. Беларус прыдумаў яшчэ і своеасаблівую ракетную сістэму залпавага агню — правобраз усім вядомай «кацюшы». Шляхціц з Віцебскага ваяводства Казімір Семяновіч зрабіў выснову аб выкарыстанні кінетычнай энергіі за 35 гадоў да таго, як Лейбніц увёў само паняцце... І гэта далёка не ўсё, што вынайшаў наш з вамі зямляк. Цяпер мы маем арыгінал выдатнай кнігі, напісанай ім на латыні. Засталося толькі дачакацца перакладчыка, які здолее класічную мову 350-гадовай даўніны перакласці на сакавітую беларускую. І трэба спяшацца. Бо сваім Семяновіча лічаць і палякі, і літоўцы... Зрэшты, такое часта бывае са славутымі беларусамі.

Што тычыцца палітыкі вяртання культурнай спадчыны ў Беларусь, то для спонсараў куплі кнігі «Вялікае мастацтва артылерыі» «БПС-Сбербанка» гэта, напэўна, стане справай звыклай. Прынамсі, так абяцае Васіль МАЦЮШЭЎСКІ, старшыня Праўлення ААТ «БПС-Сбербанк»:

— Гэта абсалютна ўсвядомлены акт. Нам двойчы прыемна, што ён прымеркаваны да 90-годдзя нашай Нацыянальнай бібліятэкі. Падобныя акты прадпрымае не толькі наш лакальны банк, але і ўся наша група ў дачыненні краін прысутнасці. Мы лічым, што гэта наша неаспрэчная карпаратыўная палітыка. Таму што бізнэс мусіць несці маральную адказнасць за тэрыторыю, на якой дзейнічае. Я сам тутэйшы — і мне вельмі важна, каб Беларусь выратала, а не страчвала — ва ўсіх сэнсах. Спадзяюся, што гэта не апошняе такое мерапрыемства. Што не толькі мы, але і прадстаўнікі іншых бізнэс-структур будуць прыходзіць у нацыянальную бібліятэку і абавязкова нешта з сабой прыносіць. Таму што жыццё — рэч хуткаплынная, а кніга — вечная.

Гаварыць пра гучныя пакупкі загадзя — справа рызыкоўная. А таму Раман МАТУЛЬСКІ, дырэктар НББ, толькі заінтрыгаваў кнігаманаў і аматараў беларускай даўніны:

— Амаль уся культурная кніжная спадчына Беларусі — за межамі Беларусі. Але яна практычна ўся знаходзіцца ў дзяржаўных сховішчах. А гэта значыць, што няважна, як яна туды трапіла — праўдамі ці няпраўдамі. У пасляваеннай Еўропе сфарміравалі заканадаўчае поле, сутнасць якога прыблізна ў наступным: на чыёй тэрыторыі культурны аб'ект знаходзіцца, той краіне ён і належыць. І ніводная з дзяржаў зараз не знаходзіцца ў такім стане, каб распрадаваць сваю культурную спадчыну. Таму нам застаецца вельмі вузкі спектр прыватных калекцый. Адтуль на рынак часам трапляе нешта вельмі рэдка. Але ў нас ёсць напрацоўкі, і магу вас запэўніць, што ў наступным месяцы мы прэзентуем яшчэ адзін неверагодна важны для беларускай культуры набытак.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

«МАЛАДОСЦЬ», ВЕРАСОВЫ БУКЕЦІК

Верас на вокладцы дзявятага нумара «Маладосці» фігуруе тры разы: назва найсціплейшай восеньскай кветкі, выява яе і... псеўданім цёзкі. Юбілей Зоські Верас адзначаны ў нумары артыкулам-успамінам Уладзіміра Содаля «Верасовы букецік». Яшчэ адна круглая дата — стагоддзе Максіма Танка — сталася нагодай змясціць на старонках часопіса лісты да народнага паэта, напісаныя рознымі людзьмі ў розныя гады. Шчырасць у іх, вастрыня пачуццяў і думак — непадробная. Такімі ж словамі можна ахарактарызаваць і размову пра сучаснае тэлебачанне ў рубрыцы «Спрэчны момант»: вострая і з характарам.



Проза нумара прадстаўлена «спантаннымі» думкамі Кацярыны Безмацерных, жыццёвымі назіраннямі Святланы Саўко, «Апошняй надзеяй» Сяргея Белаяра, а таксама заканчэннем феерычнай аповесці Алёны Беланожкі «Чамадан з кракадзілавай скуры». Паэтычныя старонкі напоўнены крышталём творчасці Дзмітрыя Пятровіча, Рагнеда Малахоўскага і Аксаны Дашкевіч.

Чытайце «Маладосць» і ў інтэрнэце — на старонцы www.maladost.lim.by.

Ад ціхай, сівой даўніны
У наша грымотнае сёння
Прыйшлі пасланцамі яны —
Пётр і яго Фяўронія.

Казаў ім славуты прарок,
— Нясіце усюдна казанне:
Сусветам валодае Бог,
А Бог азначае — каханне.

Пагаснуць галактык сляды,
Свяціла сатлее дазвання,
Хай вераць, што нават тады
На свеце не знікне каханне...

Вось гэтак яны і прыйшлі
У наша імклівае сёння —
Нясуць запавет па Зямлі
Пётр і яго Фяўронія.

Першы ў Беларусі помнік святым Пятру і Фяўронні ўсталяваны сёлета ў вёсцы Сар'я Верхнядзвінскага раёна. Гэтыя святыя здаўна з'яўляюцца апекунамі сямейнага шчасця, кахання, вернасці. Помнік перад уваходам у праваслаўную царкву паставілі невыпадкова: храм быў пабудаваны ў XIX стагоддзі як сімвал кахання і вернасці мясцовым памешчыкам Ігнаціем Лапацінскім у памяць аб каханай жонцы Марыі, якая рана пайшла з жыцця, нараджаючы трэцяе дзіця.

ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

(о проекте строительства жилого дома № 2 (по генплану) «Застройка микрорайона Лошица-9» (1-я очередь))

Информация о застройщике: Открытое акционерное общество «МАПИД», расположенное по адресу: г. Минск, ул. Р.Люксембург, 205, режим работы: понедельник –четверг – 8.30–17.30, пятница – 8.30–16.15, обед – 12.45–13.30, суббота, воскресенье, государственные праздники – выходной.

Зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100008115 решением Мингорисполкома № 197 от 26.02.2001 г.

Сведения о проектах строительства жилых домов в г. Минске, в которых принимал участие застройщик в течение трех лет, предшествующих заключению договора:

1. Жилой дом № 54 по ул. Матусевича;
2. Жилой дом № 96 по ул. Нестерова;
3. Жилой дом № 29 по ул. Казимировской.

Информация о проекте строительства:

Цель проекта – строительство многоквартирного жилого дома, в том числе строительство 50% общей площади жилых помещений для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям администраций районов г. Минска.

Начало строительства – сентябрь 2012 г., ввод дома в эксплуатацию – июнь 2013 г., благоустройство и озеленение прилегающей территории – 4 квартал 2013 г.

Положительные заключения государственной экспертизы № 256-15/12 от 11 мая 2012 г., № 650-15/12 от 24 августа 2012 г.

Местоположение строящегося многоквартирного жилого дома – г. Минск, Ленинский район, жилой дом № 2 по генплану «Застройка микрорайона Лошица-9» (1-я очередь).

Характеристика объекта.

Объект – 113-квартирный, 10-этажный крупнопанельный жилой дом серии М 464-У1 с аптекой и административным помещением, не входящими в состав общего имущества дома. Квартиры, предназначенные для заключения договоров создания объектов долевого строительства с гражданами, нуждающимися в улучшении жилищных условий, строятся с выполнением в полном объеме отделочных, сантехнических и электротехнических работ, предусмотренных проектно-сметной документацией.

Стены: наружные, внутриквартирные и межквартирные перегородки – железобетонные панели.

Перекрытия – железобетонные.

Кровля – плоская двухслойная рулонная.

Окна – из деревянного профиля со стеклопакетами.

Двери наружные (в квартирах) – щитовые.

Отопление – центральное.

Электроснабжение – скрытая проводка.

Проектно-сметной документацией предусмотрены: канализация, горячее и холодное водоснабжение, радио, телевидение, мусоропровод, лифт, лоджии, остекление лоджий.

Цены на объекты долевого строительства

Стоимость 1м² общей площади объекта долевого строительства на дату опубликования проектной декларации для граждан, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска и осуществляющих строительство

- с государственной поддержкой – **5 039 000 руб.;**
- без государственной поддержки – **5 388 000 руб.**

Права застройщика на земельный участок подтверждает решение Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г., свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения права на него от 21 мая 2012 г. № 500/600-2120. Площадь земельного участка – 0,1670 га. Благоустройство – согласно проектной документации.

Количество квартир в доме – 113.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности:

межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Предполагаемый ввод дома в эксплуатацию – июнь 2013 г., благоустройство и озеленение прилегающей территории – 4 квартал 2013 г.

Строительство дома осуществляется застройщиком на основании решения Мингорисполкома № 770 от 15 марта 2012 г. собственными силами без заключения договоров подряда.

